ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 312 (4218)
Чацьвер, 19 лістапада 1931 г.

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ — Вышэй якасьць работы сельскай спажыўкаапэрацыі (1 стар.). БАЛАБАНАЎ, СЫЦЬКО, СКАБЛОЎ — Бязьдзейнасьць, якая мяжуе з апартунізмам (2 стар.). М. ПЕРНІК — У рабочых кварталах Бэрліну (4 стар.).

Акружым пралетарскімі клопат мі савецкага інжынэра і тэхніка (1 ст).

Вопыт Амбросаўскага сельсавету — ключ да перамогі ў разгортваньні масавай работы вакол збожжазагатовак (1 стар.).

Глускі райкалгассаюз сабраўся на зімоўку (1 стар.).

БССР выканала свой абавязак перад пралетарскімі цэнтрамі (1 стар.).

Рэалізацыя шасьці сталінскіх умоў — асноўны крытэрыі пры ацэнцы дзейнасьці вытворчых парт'ячэек (2 стар.).

Змагацца за высокакваліфікаванага спэцыяліста-тарфяніка (2 стар.).

Устанавіць строгі кантроль за якасьцю ільнавалакна (3 стар.).

Паход за мільён тон сіласу яшчэ ня скончан (3 стар.).

БІБЛІЯГРАФІЯ. В. Т. — Заходняя Беларусь — плацдарм імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі (3 стар.).

ПОЛЬШЧА. Бурны мітынг бастуючых трамвайшчыкаў у Варшаве. (4 стар.).

Вышэй якасьць работы сельскай спажыўкаапэрацыі

У мэтах паляпшэньня работы спажывецкай каапэрацыі, павароту яе тварам да гаспадарчых задач раёну і калгасу, праведзена карэнная рэарганізацыя сельскай каапэрацыйнай сеткі.

У выніку рэарганізацыі, адноўлен прынцып выбарнасьці ў нізавыя зьвеньні, ліквідаваны шматкрамы, арганізаваны сельскія спажыўтаварыствы на чале з райсаюзамі.

Шасьцімесячны тэрмін зьяўляецца выстарчальным для таго, каб зараз праверыць выкананьне сельскай спажыўкаапэрацыяй тых задач, якія ставіліся перад ёю ў сувязі з рэарганізацыяй.

Адпаўленьне выбарнасьці, стварэньне вакол сельскага спажывецкага таварыства значнага актыву, самастойнасьць, якая дана ў выніку рэарганізацыі, — усё гэта на першых-жа кроках дало станоўчыя вынікі. Павялічылася зацікаўленасьць да вытворчых запатрабаваньняў калгасаў, саўгасаў, узмацніўся таваразварот, пакладзен пачатак разгортваньню самастойнай гандлёвай ініцыятывы.

Пасьля майскай адозвы ЦК УсеКП(б) і СНК СССР Белкаапсаюзам створана лесасэкцыя, якая яднае 50 рабкопаў, дарэкцыя — 11 рабкопаў, арганізавана 30 рабкопаў саўгасаў. Арганізацыя 1.420 сельспажыўтаварыстваў і каля сотні дыфэрэнцыяваных рабкопаў, якія фунцыянуюць у межах сельскай мясцовасьці — гэта ўжо сам па сабе **магутны фактар** для паляпшэньня снабжэньня рабочых, калгасьнікаў і разгортваньня савецкага гандлю.

Разам з арганізацыяй самастойных сэкцый і дыфэрэнцыяваных рабкопаў, ліквідуецца абязьлічка ў снабжэньні, работа каапэрацыі больш шчыльна зьвязваецца з вытворчасьцю, ствараюцца магчымасьці для лепшага наладжваньня кантролю зьнізу. Усё гэта — факты вялікай важнасьці.

Ёсьць ужо такія сельскія спажыўтаварыствы, якія на аснове разгортваньня ўласнай ініцыятывы павялічылі таваразварот, павысілі свой удзел у арганізацыі і ўмацаваньні калгаснай і саўгаснай вытворчасьці, паладзілі прэміяваньне ўдарнікаў, пасьпяхова выконваюць пляны загатовак.

Аднак, усе гэтыя посьпехі далёкі ад таго, што можна было-б зрабіць у перабудове работы за шасьцімесячны тэрмін.

Сельская спажывецкая каапэрацыя яшчэ не павярнулася, як сьлед, тварам да задач сацыялістычнага земляробства, і ў гэтым буйнейшы недахоп яе работы. Нізавая спажывецкая каапэрацыя не адыгрывае яшчэ тэй ролі, якая ёй належыць у справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Выкананьне таваразвароту сельскай спажыўкаапэрацыяй за другі квартал складае 85,7 проц., за трэці — 91,9 проц. і за кастрычнік — 65,8 проц. Гэта зьяўляецца яркім паказальнікам слабасьці барацьбы каапэрацыі за ўздым калгаснай вытворчасьці. Дзе-ні-дзе існуюць думкі, што крытэрыямі выміральнікам павароту тварам да калгасу зьяўляецца колькасьць пасядзеньняў камісій садзейнасьці калектывізацыі. Думаць так, гэта значыць быць далёка ад разуменьня задач сёньняшняга дня.

Павышэньне ролі каапэрацыі ў барацьбе за ўздым калгаснай вытворчасьці цалкам супадае з павышэннем таваразвароту, вышуканьнем дадатковых таварных рэсурсаў і разгортваньнем самазагатовак. Нельга забываць таго, што **разгортваньне савецкага гандлю — гэта магутны вагар узьдзейнасьці на калгасную вытворчасьць.** Гэты вагар павінен быць цалкам пастаўлен на службу сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Самым цесным чынам з гэтым зьвязана задача рэалізацыі сельска-гаспадарчай прадукцыі. У гэтым напрамку сельская спажыўкаапэрацыя атрымала значнае падмацаваньне ў твары ЗРК, якім дазволена весьці самастойна загатоўкі. Тут шырокае поле дзейнасьці для разгортваньня ініцыятывы, для наладжваньня сапраўднага савецкага гандлю.

Важнейшай умовай рэалізацыі гэтых задач зьяўляецца барацьба з праяўленьнямі «нэпманскага духу», з тэндэнцыямі «мэханічнага разьмеркаваньня», за культурны савецкі гандаль, які-б цалкам грунтаваўся на гаспадарчым разрахунку.

Між тым, перабудова работы сельскай спажыўкаапэрацыі на аснове гаспадарчага разрахунку праходзіць зусім нездавальняюча. Выбарачны агляд 15 сельспажыўтаварыстваў, які праведзен Белкаапсаюзам, паказвае, што шмат якія работнікі і нават старшыні праўленьня не разумеюць сутнасьці для разгортваньня ініцыятывы, для наладжваньня сапраўднага савецкага гандлю. Гэтым, між іншым, тлумачыцца тая інэртнасьць у разгортваньні ўласнай ініцыятывы, што панае і зараз па большасьці таварыстваў.

Ініцыятыва нізавой каапэрацыйнай сеткі ў пэўнай меры зьвязвалася райсаюзамі ў якіх да гэтага часу сканцэнтраваны і на сутнасьці абязьлічаны сродкі сельспажыўтаварыстваў. Белкаапсаюз толькі зараз даў дырэктыву аб адкрыцьці ў банку бягучага рахунку сельспажыўтаварыствам. Аднак, гэта дырэктыва ажыцьцяўляецца марудна. Бягучы рахунак мае меншая частка сельскіх спажыўтаварыстваў. У даным выпадку мы маем справу з сваясаблівай боязьню, за якой хаваецца супраціўленьне гаспадарчаму разрахунку. Гэта «боязнь» ад Белкаапсаюзу перадалася райсаюзам і зьяўляецца істотным тормазам у разгортваньні савецкага гандлю.

Гэты тормаз, як і цэлы рад другіх непаладак, зьвязаных з тэхнікай справы, павінен быць у самы кароткі тэрмін ліквідаваны.

Рэалізуючы пастанову кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні савецкага гандлю і паляпшэньні спажэньня рабочых, райпартарганізацыі, побач з другімі пытаньнямі, павінны **асаблівую ўвагу аддаць укараненьню гаспадарчага разрахунку** ў сыстэму спажыўкаапэрацыі.

Папырэньне правоў сельспажыўкаапэрацыі павінна быць усямерна выкарыстана для павялічэньня таваразвароту праз разгортваньне самазагатовак, вышуканьне дадатковых таварных рэсурсаў і арганізацыі дапаможных прадпрыемстваў. Ад таго, як будзе разгорнута гэта работа ў вялікай меры залежыць далейшае паляпшэньне грамадзкага харчаваньня і снабжэньня рабочых.

«Для нас, для БССР, задача скарыстаньня мясцовых рэсурсаў зьяўляецца актуальнейшай задачай. Зразумела, што мабілізацыю дадатковых крыніц унутраных рэсурсаў можна праводзіць толькі тады, калі мы выканаем нашы заданьні па загатоўках усіх відаў». (Гей. З дакладу на сходзе менскага партактыву).

У непасрэднай сувязі з разгортваньнем гэтай работы знаходзіцца справа паляпшэньня ўнутранай арганізацыі работы магазынаў. Асноўнае зло—гэта **ўраўнілаўка ў зарплаце.** Адсюль пяўважлівыя адносіны да патрэб спажыўца, марудны зварот тавараў, адсутнасьць ініцыятывы і г. д.

Укараненьне зьдзельшчыны, г. зн. аплаты ў процантах ад звароту, павінна займаць цэнтральнае месца ў рабоце па наладжваньні ўнутранога распарадку ў магазынах і загатоўчых пунктах. Там, дзе гэты прынцып ужо ажыцьцёўлен, **дзе ўстаноўлена матар'яльная зацікаўленасьць работнікаў, там паскоран таваразварот,** там пастаўлена работа так, як гэтага патрабуе спажывец, а не наадварот.

Сур'ёзнай перашкодай на шляху разгортваньня савецкага гандлю зьяўляецца недастатковая падрыхтоўка і дрэнны склад кадраў.

«Кадры, накіраваныя ў гандлёва-каапэрацыйны апарат, яшчэ не аўладалі тэхнікай дзяржгандлёвай справы і не ажыцьцяўляюць канкрэтнага кіраўніцтва каапэрацыйнай работай, дзякуючы чаму работа гандлёва-каапэрацыйнага апарату скрыўляецца ўсімі бюракратычнымі і чужымі рабочай кляссе элемэнтамі, якія яшчэ складаюць значную праслойку ў гэтым апараце» (з пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б).

Характарыстыка кадраў, якая дана пленумам ЦК УсеКП(б), цалкам адносіцца і да БССР. Найўнасьць у каапэрацыйна-гандлёвым апараце чужых элемэнтаў, слабасьць аўладаньня тэхнікай гандлю дае сябе асабліва адчуваць у рабоце вясковай сеткі спажывецкай каапэрацыі.

Відавочна, што як Белкаапсаюзу, так і рэённым каапэрацыйным, партыйным і прафэсыянальным арганізацыям зараз больш як калі трэба ўзяцца за падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў для работы ў каапэрацыі.

Пара канчаткова зьнішчыць практыку перакідкі работнікаў каапэрацыі на іншую работу з тэй прычыны, што «селядцамі гандляваць справа простая, кожны зможа». Выганяючы кулацкія і нэпманскія элемэнты, выкараняючы бюракратызм з апарату, мы павінны разам з тым стварыць такія ўмовы, пры якіх працаўнікі каапэрацыі, не адрываючыся ад работы, маглі-б павышаць сваю кваліфікацыю.

Рост сацыялістычнай індустрыі як цяжкой, так і лёгкай, посьпехі ў галіне калгаснага і саўгаснага будаўніцтва стварылі вялікія магчымасьці для сыстэматычнага паляпшэньня снабжэньня рабочых і калгасных мас.

Задача зараз — перабудаваць работу каапэрацыі так, каб яна з найбольшым эфэктам выкарыстоўвала ўсё ўзрастаючыя магчымасьці для паляпшэньня снабжэньня рабочых і калгасьнікаў.

«Настойлівая работа над паляпшэньнем дзяржаўна-каапэрацыйнага гандлёвага апарату, самая жорсткая барацьба з бюракратызмам і наогул з буржуазнымі тэндэнцыямі ў ім, прыцягненьне да самага актыўнага ўдзелу ва ўсёй гэтай справе шырокіх пластоў рабочых і калгасьнікаў у вёсцы — усё гэта можа і павінна даць значнае паляпшэньне ў снабжэньні ўжо ў бліжэйшы час» (**Молатаў**).

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку"

ВОПЫТ АМБРОСАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ВУЧЫЦЬ,

ШТО КЛЮЧ ДА ПЕРАМОГІ—У РАЗГОРТВАНЬНІ МАСАВАЙ РАБОТЫ ВАКОЛ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, У АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ УМАЦАВАНЬНІ КАЛГАСАЎ

Мэханіка перамог амбросінцаў

СІРОЦІНА.

Амбросаўскі сельсавет, які скончыў у асноўным суцэльную калектывізацыю, дабіўся рашаючых посьпехаў у здачы збожжа. Гадавы плян загатовак па калгасным сэктары выкананы па збожжы на 112 проц., па бульбе — на 110 проц., па сене — на 172 проц. У аднаасобным сэктары загатоўлена збожжавых культур звыш 75 проц. пляну.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў і разгортваньню масавай работы вакол загатовак. У сельсавеце была створана камісія садзейнасьці загатоўкам, у якую ўваходзілі прадстаўнікі мясцовых арганізацый, настаўнікі і актывісты-калгаснікі і аднаасобнікі. Члены камісіі былі прымацаваны да паасобных пунктаў і калгасаў. Сыстэматычна праводзілася праверка выкананьня плянаў, шляхам падворных абходаў, наладжвалася ўзаемадапамога перадавых калгасаў адсталым. Увесь час не паслаблялася ўвага да збожжазагатовак. Пытаньне гэта ня зьнімалася з парадку дня пленуму сельсавету. Пленумы праводзіліся пашыраныя з удзелам старшынь калгасаў і сельсавецкага актыву. На кожным пасяджэньні пленуму старшыні 2-3 калгасаў рабілі справаздачы аб выкананьні плянаў загатовак.

За невыкананьне цьвёрдых заданьняў прыцягнуты да адказнасьці 5 кулацка-заможных гаспадарак.

Ёсьць бліскучыя прыклады загатоўчай работы па асобных калгасах. Так, калгасы «Чырвоная вышка», імя Варашылава, «1 мая», імя Якаўлева наладзілі двухзьмённую малацьбу. Малацьба ў калгасах праходзіла пад лёзунгам: У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯНЫ ЗАГАТОВАК, А ПОТЫМ МАЛАЦІЦЬ ДЛЯ СВАІХ ПАТРЭБ.

Трэба адзначыць, што паасобныя калгасы, вызваленыя ад загатовак па прычыне недароду (вымачка пры весьнавой паводцы), прынялі актыўны ўдзел у кампаніі. Так, калгас «Шлях Леніна» здаў каля 4.000 кілё збожжа, калгас імя 12-годзьдзя Кастрычніка—1.240 кілё.

Амбросаўскі сельсавет павінен быць прэміяваны за выкананьне пляну збожжазагатовак.

А. М.

Праверыць, як калгасы здаюць збожжа

БАРЫСАЎ.

Барысаўскі райкалгассаюз дагэтуль не правёў растлумачальнай работы сярод калгаснікаў аб здачы прадукцыі **ў першую чаргу** дзяржаве. Па прычынах слабой растлумачальнай работы, дагэтуль не ліквідаваны кулацка-спажывецкія настроі ў радзе калгасаў. Ёсьць факты, калі праўленьні калгасаў, пад уплывам кулацкай агітацыі, адмаўляюцца здаваць збожжа, заяўляючы, што ў іх няма чаго здаваць (калгасы «Шлях сацыялізму», «Уход» і імя Будзённага).

Барысаўскі райкалгассаюз павінен праверыць, як калгасы раёну выконваюць пляны загатовак і прыцягнуць да адказнасьці тых старшынь праўленьняў, якія зрываюць здачу збожжа.

З 800 цэнт. спагнана 34

КАПЫЛЬ.

Кулацка-заможныя гаспадаркі Капыльскага раёну выканалі толькі 18,5 проц. цьвёрдых заданьняў па збожжы. Гэта тлумачыцца поўнай адсутнасьцю націску на кулацкія гаспадаркі, няпрыняцьцем мер да спагнаньня збожжа.

Ганебныя факты патураньня кулацтву выяўлены па Бабаўнянскім сельсавеце, дзе плян спагнаньня цьвёрдых заданьняў выкананы толькі на 4,2% — з 800 цэнтн. сабрана 34. Парт'ячэйка Бабаўнянскага сельсавету зусім ня цікавілася загатоўкамі. Сакратар ячэйкі тав. **Нячай** толькі адзін раз паставіў пытаньне аб загатоўках на бюро ячэйкі. Кулак, карыстаючыся бязьдзейнасьцю мясцовых арганізацый, сабатуе збожжазагатоўкі і збывае прадукцыю на прыватным рынку.

Варавацкі.

Вопыт перадавікоў не папулярызаваны

ВУШАЧЫ. Партыйныя і савецкія арганізацыі Вушаччыны абавязаліся да 14-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі выканаць 80 проц. збожжазагатоўчага пляну. Аднак, апошнія даныя аб ходзе загатовак паказваюць, што Вушацкі раён сваіх абавязацельстваў ня выканаў, хаця за апошнюю пяцідзёнку кастрычніка тэмпы загатовак павялічыліся з 35,4 да 51 проц., але першыя пяцідзёнкі лістапада зноў далі зьніжэньне крывой загатовак.

Раённыя арганізацыі не наладзілі абмену вопытам загатоўчай кампаніі паміж сельсаветамі і калгасамі, не паладзілі ўзаемадапамогі і грамадзкага буксіру перадавых калгасаў над адсталымі.

Весьніцкі сельсавет выканаў плян збожжазагатовак на 86 проц., калгасы гэтага сельсавету здалі 272 проц. заданьня. Аднак, вопыт перадавікоў не папулярызаваны, не пашыраны па іншых сельсаветы. 9 лістапада павінен быў быць склікан зьлёт перадавых калгасаў раёну, але ніхто нічога не зрабіў, каб арганізаваць гэты зьлёт, і ў выніку каштоўная ініцыятыва была правалена. На запытаньне, чаму сарваны зьлёт, сакратар райкому тав. **Драйчук** адказаў: «Усе людзі заняты бульбай і няма калі склікаць яго».

Старшыня райспажыўсаюзу **Нэйдлін** лічыць, што «зараз ёсьць важнейшыя справы, а збожжа не памерзне, калі мы яго загатовім зімою». Старшыня райкаапсаюзу **Квятко** нават не прачытаў дырэктыў ЦК і ОН аб загатоўках збожжа і бульбы. «Раённыя ўстановы па раённых загатоўчых арганізацыях, нізавыя зьвеньні не праводзілі ніякай масава-растлумачальнай работы сярод калгаснікаў, бедноты і сераднякоў-аднаасобнікаў. Гарбачыцкая і Жарская партыйныя ячэйкі зусім скаціліся з бальшавіцкіх рэйсаў і ні разу ня ставілі пытаньня аб спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулакоў і заможнікаў. Райком КП(б)Б распусціў бюро Жарскай парт'ячэйкі, абвясьціў вымову ўсяму яго складу, таксама членам бюро Гарбачыцкага парт'ячэйкі. Зьняты з работы і выключаны з партыі старшыня Чэрачоўшчынскага сельсавету **Лукаш Голік**, старшыня калгасу «Трактар» гэтага-ж сельсавету **Клопаў**, якія патурялі кулацка-спажывецкім тэндэнцыям. Але вакол гэтых мер не мабілізавана партыйная грамадзкасьць раёну; увага раённай арганізацыі яшчэ не скаг... цэнтравана на барацьбе з права-апартуністычнай практыкай і «левымі перагібамі ў загатоўках.

Вушаччына павінна дабіцца рашаючага пералому ў збожжазагатоўках.

П. Ч. і Я. Л.

Апэрацыйнае кіраўніцтва загатоўкамі не наладжана

КРУПКІ.

Збожжазагатоўкі па Крупскім раёне разгортваюцца надзвычай павольна. Да апошняга часу плян загатовак выкананы толькі на 35 проц. Рад сельсаветаў (Траяноўскі, Заборскі, Нацкі) здалі ня больш 15 проц.

Адна з прычын дрэннага ходу загатовак—**вельмі слабае апэрацыйнае кіраўніцтва** загатоўчай кампаніяй з боку райвыканкому, які замяняе масавую работу на месцы канцылярскімі цыркулярамі і рассылкай пастаноў прэзыдыуму.

Упаўпаважаныя РВК не аказваюць канкрэтнай дапамогі сельсаветам, большасьць іх займаецца гастралёрствам і зборам вестак.

Спажывецкая каапэрацыя і райкаапсаюз ня выплацілі здатчыкам звыш 80.000 руб., што, зразумела, адмоўна адбіваецца на ходзе загатовак.

Пастановы ЦК, СНК і Калгасцэнтра аб забароне складаньня розных фондаў да поўнага выкананьня плянаў загатовак не даведзены да калгасаў і не прапрацаваны. На гэтай прычыне калгасы «Атраднае» і «Гігант» дагэтуль яшчэ гуляраць аб «перэльнасьці» заданьняў, аб немагчымасьці іх выкананьня.

Далей так працаваць нельга.

ЖАЛА.

БССР выканала свой абавязак перад пралетарскімі цэнтрамі

Ленінграду і Маскве адгружана 102 проц. пляну бульбы

Руйнуючы ўдар па малаверах

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыі, мабілізацыі мас на барацьбу за выкананьне загатоўчых плянаў і рашучаму змаганьню з кулацтвам і яго агентурай, якія імкнуліся сарваць загатоўкі, БССР атрымала вялікую перамогу на фронце рабочага снабжэньня. Плян адгрузкі бульбы Маскве і Ленінграду перавыкананы.

Пралетарская грамадзкасьць Савецкай Беларусі выканала свой абавязак перад пралетарскімі цэнтрамі.

Гэта перамога наносіць руйнуючы ўдар па малаверах і ныціках, якія ня вераць у рэальнасьць загатоўчых плянаў.

Мабілізаваўшы ўсе сілы, сканцэнтраваўшы максымум увагі на загатоўцы і адгрузцы бульбы, правільна зразумеўшы свой абавязак перад пралетарыятам Савецкага Саюзу, рад раёнаў значна перавыканалі заданьні па адгрузцы. Аб іх павінна ведаць савецкая грамадзкасьць — гэта Талочынскі, Рэчыцкі, Жлобінскі, Быхаўскі, Магілёўскі і Лепельскі раёны.

Посьпехі, дасягнутыя на фронце адгрузкі бульбы за межы БССР, ні ў якім разе не павінны выклікаць дэмабілізацыйных настрояў, аслабленьня тэмпаў работы.

Неабходна адразу-ж пераключыцца на фарсаваньне загатовак збожжа, ільну, жывёлы, якія праходзяць нездавальняюча. Наперадзе яшчэ вялікая работа па загатоўцы бульбы для патрэб гарадоў і прамысловасьці БССР.

Арганізацыі БССР павінны напружыць усе сілы, каб дабіцца рашаючых перамог на **ЎСІХ** вучастках загатоўчага фронту.

РАПАРТ

Сыстэма Белхлебжывёлсаюзу выканала плян адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам на 111,5 проц. Трэба было адгрузіць 39.812 тон, адгружана 44.410. Ударнымі тэмпамі праводзім далей адгрузку.

Белхлебжывёлсаюз

КРЫВАШЭІН.

102 проц. заданьня

БССР, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК, ПЕРАВЫКАНАЛА ЗАДАНЬНЕ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ МАСКВЕ І ЛЕНІНГРАДУ. НА 15 ЛІСТАПАДА АДГРУЖАНА 102 ПРОЦ. АГУЛЬНАГА ЗАДАНЬНЯ. ЯШЧЭ РАЗ НА СПРАВЕ ДАКАЗАНА ПОЎНАЯ РЭАЛЬНАСЬЦЬ НАШЫХ ЗАГАТОЎЧЫХ ПЛЯНАЎ.

БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ АЖЫЦЦЯЎЛЯЮЧЫ ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ, БССР МОЖА СЁНЬНЯ З ГОНАРАМ РАПАРТАВАЦЬ АБ ВЫКАНАНЬНІ АБАВЯЗКАЎ ПЕРАД ПРАЛЕТАРАМІ ЛЕНІНГРАДУ І МАСКВЫ. ПРАЛЕТАРСКІЯ ЦЭНТРЫ САЮЗУ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ ДОБРАЙ ПА ЯКАСЬЦІ ПРАДУКЦЫІ.

Р. П.

ГЛУСКІ РАЙКАЛГАССАЮЗ сабраўся на зімоўку

Кіраўніцтва зяблівай кампаніяй у раёне спынена

Улік спынілі—

весткі для НКЗБ бяруцца з архіву

ГЛУСК.

Некаторыя сельсаветы і калгасы раёну па-бальшавіцку справіліся з заданьнем па ўздыме зяблівы, выканаўшы і перавыканаўшы пляны. **Загальскі** сельсавет, якому паводле пляну трэба было зазяблiць 400 га, яшчэ ў кастрычніку рапартаваў аб выкананьні пляну. Калгасы **«Серп і молат», «Чырвоны партызан»**, Клятнянскага сельсавету, перавыканалі свае пляновыя заданьні і зяблівы ня спыняюць. **«Серп і молат»** замест 116 га на 10 лістапада ўзараў 151, калгас **«Чырвоны партызан»** перавыканаў сваё заданьне на 15 га: замест 50 узараў 65 га. Але ёсьць і такія калгасы, якія зяблівы распачалі толькі 15-га лістапада (калгас **«Вяршына сацыялізму»**). Плян ворыва выкананы на раёне на 10-га лістапада ўсяго на 53,9 проц.

Такі нізкі процант выкананьня тлумачыцца няўмелым кіраўніцтвам з боку раённых зямельных органаў і пануючай стаўкай на самацёк.

На дырэктыву партыі і ўраду аб пераключэньні 50 проц. коняй на зяблівы глускія кіруючыя раённыя арганізацыі не адгукнуліся. Да гэтага часу раённыя арганізацыі ня ведаюць колькі коняй занята на ворыве. Праверка, як выконваецца дырэктыва калгасамі і сельсаветамі, не арганізавана. Коняй на ворыве працуе не больш 20 проц. Таму і ня дзіва, што ў калгасе **«Вяршына сацыялізму»** кони ўвесь час хадзілі па сенажаці без работы, а зяблiць пачалі толькі 15 лістапада.

Л. Ягорчанка.

Дырэктыва засталася на выкананай

СЛУЦАК.

Калгасы **«Камінтэрн» і «Чырвоны пуцілавец»** першымі ў раёне выканалі і перавыканалі пляны зяблівы. **«Камінтэрн»** замест 57 га паводле пляну, узараў 91 га. Але цалкам па раёне становішча з зяблівам пагражаючае. Плян выкананы толькі **на 46 проц.** Такі нізкі процант выкананьня пляну зусім ня турбуе зямельна-калгасныя органы Случчыны. Даныя імі дырэктывы аб максымальным скарыстаньні коняй на ворыве і перакідцы на зяблівы 100 проц. трактараў, не праверены і ніякай масавай работы вакол іх не вядзецца. У выніку гэтага дырэктыва засталася дырэктывай, а асноўная цягавая сіла на выкананым пляну зяблівы не пераключана і гэтага часу.

Раўнаючыся па перадавых калгасах «Камінтэрн» і «Чырвоны пуцілавец» Случчына павінна ліквідаваць свае адставаньне, мабілізаваўшы масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў, каб да пагадыходзячых марозаў, у самы кароткі тэрмін поўнасьцю выкапаць плян зяблівы.

Я.

АКРУЖЫМ ПРАЛЕТАРСКІМІ КЛОПАТАМІ САВЕЦКАГА ІНЖЫНЭРА І ТЭХНІКА

Аб паляпшэньні бытавых умоў інжынэрна-тэхнічных работнікаў чыгуначнага транспарту

ЗАГАД НКШЗ ад 15 лістапада 1931 году № 2589

У адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК СССР ад 1 жніўня 1931 году і дадаткова да раней прынятых мерапрыемстваў па паляпшэньні бытавых умоў інжынэрна-тэхнічных работнікаў загадваю:

Дырэктарам чыгунак, заводаў і начальнікам раёнаў:

1. Ва ўсіх жылых дамах, якія перадаюцца ў эксплёатацыю ў 1931 і 1932 г. г., а таксама і ў тых, што вызваляюцца ад набочных транспарту асоб, **выдзеліць ня менш 10 проц. ад агульнага жыльфонду па чыгунцы для працаўнікоў ІТР,** прадастаўляючы жыллёшчу ў першую чаргу ІТР, якія жывуць у вагонах, **і ІТР-ударнікам.**

2. У месячны тэрмін правесьці перараз мерканьне кватэр у дамах, якія належаць чыгуначнаму транспарту, з такім разьлікам, каб ІТР, **зьвязаныя з рухам цягнікоў, былі размешчаны ў бліжэйшых да вытворчасьці жылых дамох за лік катэгорый працаўнікоў, ня зьвязаных непасрэдна з рухам цягнікоў** (рахункаводы, канторшчыкі і інш.).

3. Кіраўніцтву працы сумесна з ЦБ ІТС і ЦК саюзу чыгуначнікаў у дэкадны тэрмін распрацаваць практычныя мерапрыемствы па арганізацыі на буйных чыгуначных вузлох (Масква, Ленінград, Харкаў, Растоў, Кіеў, Самара, Ташкент, Алма-Ата, Н.-Сібірск, Чыта, Сьвярдлоўск, Чалябінск і інш.) жыльбудаўнічых каапэратываў ІТР. Кіраўніцтву працы і ЦПТЭУ у кантрольных лічбах 1932 г. прадугледзець суму 10 млн. руб. для фінансаваньня жыльбудаўнічых каапэратываў ІТР. ЦУС забясьпечыць на гэту суму адпаведныя матар'яльныя фонды.

4. Да 1-га сьнежня 1931 г. у пунктах, найбольш адказных па выкананьні асеньня-зімовых перавозак — у Маскоўскім, Ленінградзкім, Харкаўскім і інш. вузлох — і буйных новабудоўлях **арганізаваць сталовыя і разьмеркавальніі для ІТР.** Дырэктарам чыгунак, заводаў і нач. раёнаў і нач. новабудоўляў супольна з РТПО забясьпечыць памяшканьні і абсталяваньне. ЦФУ забясьпечыць фінансаваньнем арганізацыю ў бягучым годзе сталовых ІТР у суме 740.000 руб. і разьмеркавальнікаў у суме 1.800.000 руб.

Ва ўсіх іншых пунктах інжынэрна-тэхнічных работнікаў **у дзкадны тэрмін** прымацаваць да існуючых рабочых сталовак і разьмеркавальнікаў.

5. Дырэктарам чыгунак, заводаў, лесатрангасаў і нач. раёнаў і новабудоўляў супольна з райТПО неадкладна праверыць снабжэньне ІТР у адпаведнасьці з пастановай ураду, забясьпечыўшы снабжэньне ІТР нароўні з індустрыяльнымі рабочымі.

6. Кіраўніцтву працы супольна з Цустрахам і ЦБ ІТС у 5-дзенны тэрмін распрацаваць парадак прадастаўленьня ІТР пуцёвак у санаторыі, далёкія мы адпачынку Цустраху нароўні з **індустрыяльнымі рабочымі,** забясьпечыўшы выдачу пуцёвак для ІТР у разьмеры ня менш 15 проц. ад агульнай колькасьці пуцёвак, якія даюцца работнікам дарогі.

7. У кантрольных лічбах па 1932 год асобным артыкулам па ФЗБР, Кіраўніцтве працы і ЦПТЭУ прадугледзець 1.700.000 руб. па рамонт, пашырэньне існуючых дамоў адпачынку ЦБ ІТС і адкрыцьцё новых у Казакстане, Сярэдняй Азіі, Сібіры, Д. Усходзе і прыгарадах Масквы.

8. Замацаваць за ЦБ ІТС былое памяшканьне курсаў Паўн.-Каўказ. чыгункі ў Кіславодзку для адкрыцьця здраўніцы ІТР, якая пастаянна функцыянавала.

9. Кіраўніцтву падрыхтоўкі кадраў на 1932 г. забясьпечыць поўнасьцю прыём дзяцей ІТР ва ВТНУ і тэхнікумы нароўні з дзецьмі рабочых.

10. Ня гледзячы на выразныя дырэктывы партыі і ўказаньні тав. Сталіна аб уважлівых і бярэжлівых адносінах да ІТР, тым ня менш на практыцы маюць месца грубыя скажэньні ўказаных дырэктыў. Абавязваю кіраўнікоў чыгунак, аб'яднаньняў, заводаў, лесатрангасаў і раёнаў забясьпечыць поўнае выкананьне дырэктыў партыі і ўраду ў адносінах інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

11. **Пэрсанальную адказнасьць за выкананьне гэтага загаду ўскладаю на дырэктароў чыгунак, нач. аб'яднаньняў, новабудоўляў, раёнаў, дырэктароў заводаў, а па НКШЗ — на ЦЗ тав. Булата.**

12. Нач. кіраўніцтва кантролю і праверкі выкананьня тав. **Разэнталю** праверыць і далажыць мне праз месяц выкананьне гэтага загаду.

Народны камісар шляхоў зносін СССР

АНДРЭЕЎ.

Нач. кіраўніцтва працы, член калегіі

КАЛАШНІКАЎ.



Клінічны гарадок у Менску.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

РЭАЛІЗАЦЫЯ ШАСЬЦІ СТАЛІНСКІХ УМОУ—

асноўны крытэры пры ацэнцы дзейнасьці вытворчай парт'ячэйкі

У СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧУЮ КАМПАНІЮ ПАРТОРГАНАЎ ПАВЫСІЦЬ АРГАНІЗАТАРСКУЮ І КІРУЮЧУЮ РОЛЮ ПАРТЫЙНЫХ ГРУП, ЗЬМЕННЫХ І ЦЭХАВЫХ ЯЧЭЕК КП(б)Б

Перабудовай партработы павысім вытворчыя посьпехі

Вытворчыя парткалектывы і ячэйкі ўступілі ў палясу справаздачна-перавыбарчай кампаніі. У дырэктыўным лісьце ЦК КП(б)Б аб перавыбарах выразна вызначаны задачы партарганізацый у правядзеньні гэтай важнейшай палітычнай кампаніі, з асаблівай сілай канцэнтруецца ўвага на неабходнасьці забясьпечыць выкананьне вытворчай праграмы бягучага году і падрыхтоўку да надыходзячага чацьвертага завяршаючага году пяцігодкі.

Асноўнымі вагарамі, якія вырашаюць пасьпяховае выкананьне пастаўленай задачы, у першую чаргу зьяўляецца завяршэньне перабудовы партыйна-масавай работы па вытворчасьці, упартая барацьба за поўную ліквідацыю абязьлічкі ў рабоце і «лявацкай» дробна - буржуазнай ураўнілаўкі ў зарплаце, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ва ўсе вытворчыя зьвеньні. Толькі пры ўмовах сапраўднага пераключэньня на новыя мэтады работы, аб якіх гаварыў на нарадзе гаспадарнікаў тав. Сталін, пры ўмовах поўнага ажыцьцяўленьня яго праграмных установак у гэтай прамове, можна ліквідаваць тое адставаньне, якое мае месца па радзе прадпрыемстваў БССР, і забясьпечыць исправыкананьне вытворчай праграмы.

Што гэта іменна так, ня лінім будзе спасланца на канкрэтныя факты работы парткалектыву віцебскай фабрыкі «Прафінтэрн». Там работай паповаму, лішэ цыяй абязьлічкі і ўраўнілаўкі выведзена фабрыка з адставаньня. Калі прамфінплян недавыконваўся па працягу ўсяго першага паўгодзьдзя, дык плян трэцяга кварталу выкананы з посьпехам. Паасобныя дахі перавыканалі свае заданьне. У такой-жа мерэ факты пералому ў бок паляпшэньня барацьбы за вытворчыя перамогі падаюцца сёньня і па жлобінскім лесазаводзе. І паадварот, там, дзе ёсьць апартуністычнае хныканьне аб «нерэальнасьці» плянаў і стаўка на самацёк замест бальшавіцкай работы, там вытворчыя непаладкі, сыстэматычнае недавыкананьне прамфін пляну. Найбольш ганебным адставаньнем сярод усіх прадпрыемстваў БССР выдзяляецца папяровая фабрыка «Герой працы», якая не дасягнула яшчэ і 50 проц. выкананьня прамфінпляну.

Нельга з посьпехам змагацца за вытворчыя перамогі без перабудовы работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, бяз правільнай расстаноўкі партыйных сіл і ўзначаленьня партарганізацыямі творчай актыўнасьці рабочых мас. Нельга з посьпехам арганізоўваць масы на барацьбу за прамфінплян без паказаў самімі камуністамі сапраўдных узорных тэмпаў у вытворчай рабоце. А што мы маем на паасобных прадпрыемствах у гэтай справе, у прыватнасьці на тай-жа папяровай фабрыцы? Там толькі 41 проц. камуністаў ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Роўназначных фактаў не наглядаецца на колькі-небудзь значнай колькасьці прадпрыемстваў, бадай, папяровая фабрыка зьяўляецца выключэньнем, але ўсё-ж такі мноцімі яшчэ вытворчымі парткалектывамі ня выкананы поўнасьцю дырэктывы партыі аб пагалоўным уцягненьні ў сацспаборніцтва і ўдарніцтва камуністаў і камсамольцаў.

Правядзячы справаздачна-перавыбарчую кампанію для пашырэньня сад знакам замацаваньня посьпехаў перабудовы ўсёй партыйна-масавай работы на вытворчасьці, завяршэньня гэтай перабудовы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі, трэба ў максымальнай меры выкарыстаць перавыбарчую кампанію для пашырэньня сад спаборніцтва і галоўным чынам яго асноўных новых форм—гаспадарча-разрахунковых брыгад і зьменна-сустрэчных плянаў.

„Герой працы“ мае ўсе магчымасьці для ліквідацыі свайго адставаньня

Партыйны калектыў папяровай фабрыкі «Герой працы» надыходзіць да перавыбараў з вельмі вялікімі недахопамі ў сваёй рабоце. Галоўны недахоп заключаецца ў тым, што парткалектыў не забясьпечыў сваёй работай вытворчых посьпехаў свайго прадпрыемства. Фабрыка за ўвесь мінулы год ці ў адным квартале нават і напалову ня выканала сваёй вытворчай праграмы. За першы квартал прамфінплян выкананы толькі на 31,7 проц., а за другі—на 24,2 проц.

У пачатку трэцяга кварталу было зьменена кіраўніцтва парткалектывам за праваапартуністычную практыку. Новае кіраўніцтва забясьпечыла некаторы, але зусім яшчэ нязначны зрух. Прамфінплян за трэці квартал выкананы зноў такі на 49,2 проц. Асноўным бічом прамфінпляну зьяўляецца прастоі, якія маюць тэндэнцыю да павялічэньня. Калі ў верасьні месяцы было 848 гадзін прастою, дык гэта лічба за кастрычнік павялічылася да 1.048. Як прастоі, так і рад іншых вытворчых непаладак не займалі належнай увагі партыйнай арганізацыі фабрыкі. Парткалектыў яшчэ да гэтага часу не перабудаваў сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі. Не настаўлена ў цэнтры ўвагі барацьба за рэалізацыю шасьці сталінскіх умоў. На фабрыцы налічваецца 12 цэхавых парт'ячэек, але-ж работа іх у нізавых вытворчых зьвеньнях вельмі слаба адчуваецца. Парт'групы, якіх налічваецца каля 46-ці, у большасьці зусім не працуюць. За чатыры месяцы не праведзена ні адной нарады з парторгамі, няма належнага кіраўніцтва іх работай.

Вытворчы цэх на фабрыцы зьяўляецца ня асноўным. Ад яго залежыць работа ўсёй фабрыкі. Але-ж зьменныя ячэйкі гэтага цэху працуюць слаба, без належнага кіраўніцтва з боку парт комаў. Паасобныя камуністы ня толькі не ўзначальваюць актыўнасьці рабочых мас і творчай ініцыятывы, а часамі зьяўляюцца глушыцелямі гэтай ініцыятывы. Калі па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі пачалі арганізоўвацца новыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады, некаторыя камуністы выступалі на сходах рабочых супроць арганізацыі такіх брыгад. Загадчык цэху Бялькевіч сваімі фармальна бюракратычнымі адносінамі да асноўных задач тармазіў арганізацыю гаспадарча-разрахункових брыгад. У цэху пануе ўраўнілаўка і абязьлічка. Трыкутнік цэху не змагаецца за ліквідацыю гэтых перашкод у вытворчай рабоце.

Лепш стаіць справа па камэрным цэху. Парт'ячэйка гэтага цэху сапраўды павярнулася тварам да вытворчых задач. Ячэйка сур'ёзна ўзялася за перавод цэху і брыгад на гаспадарчы разрахунак. Створаныя чатыры гаспадарча-разрахунковыя брыгады паказалі бліскучыя посьпехі ў сваёй рабоце. Брыгада сшыткавага аддзяленьня дабілася павялічэньня прадукцыйнасьці працы на 25 проц. пры памяншэньні колькасьці рабочых. Калі раней 45 работніц давалі 320.000 сшыткаў у дзень, дык зараз 38 работніц даюць 400.000 сшыткаў. Значна палепшылася якасьць паперы. У сувязі з гэтымі посьпехамі іншыя работніцы, якія былі па-за гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі, пачалі падаваць заявы аб пераводзе па гаспадарчы разрахунак.

Паўтараем, што больш-менш здавальняюча пастаўлена работа толькі ячэйкі паккамэрнага цэху. Галоўны недахоп у рабоце большасьці ячэек—гэта тое, што яны зусім слаба змагаюцца за правядзеньне ў жыцьцё ўказаньняў т. Сталіна. Гэтым пытаньні, рэалізацыяй якіх забясьпечваецца бязумоўнае выкананьне прамфінпляну, павінны быць чырвонай ніткай працяг нуты ва ўсёй рабоце партыйнага калектыву па правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі парторганаў.

НЭЙДЛІН.

Пераключыліся на новыя мэтады работы

На працягу доўгага часу вельмі слаба адчувалася работа партыйнага калектыву на віцебскай швэйнай фабрыцы «Прафінтэрн». У рэзультаце невыстарчальнага навароту парткалектыву тварам да вытворчасьці, невыкананьня дырэктыў партыі аб перабудове работы, фабрыка недавыканала на 11 проц. прамфінплян за першае паўгодзьдзе.

Пасьля сыгналаў «Зьвязды» аб становішчы Віцебскай партарганізацыі і пастановы ЦК КП(б)Б абноўленае кіраўніцтва парткалектыву фабрыкі пабазовому разгарнула работу, накіраваную на ліквідацыю недахопаў. У аснову гэтай работы была пастаўлена задача рэалізацыі шасьці сталінскіх умоў. Рабочыя фабрыкі па чацьверты квартал высунулі сустрэчную лічбу—25 адзінак на зьмену, замест 20 плянавых. Тэмпы работы ў чацьвертым квартале павышаны. Зараз з посьпехам укараняецца гаспадарчы разрахунак. Партыйная работа ў тазным вытворчым зьвяне палепшылася. Нізавыя партыйныя зьвеньні пачынуць падымілі да практычнага ажыцьцяўленьня чарговых задач партыі. Аб гэтым сьведчыць рад канкрэтных паказальнікаў. Фінансавы плян чацьвертага кварталу ўжо зараз выкананы на 120 проц. Дасягнуты зрухі і ў правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі. На прадпрыемстве працуюць тры гурткі па беларусізацыі, арганізаван лікпункт па польскай мове і г. д. За апошні час 50 перадавых рабочых-ударнікаў падалі заявы аб уступленьні ў партыю. Тут неадкладнай задачай парткалектыву павінна быць забясьпячэньне марксыцка-ленінскага выхаваньня гэтага новага папаўненьня партыі.

Ударны.

Ня спыняцца на дасягнутых посьпехах

Партыйная ячэйка Жлібінскага лесазаводу за апошні час дабілася раду посьпехаў у барацьбе за прамфінплян. Калі ў першым паўгодзьдзі вытворчая праграма недавыконалася, дык у трэцім квартале ўзяты такія тэмпы, якія забясьпечылі ня толькі выкананьне прамфінпляну, а і значна пакрылі запазычанасьць першага паўгодзьдзя. Гадавы плян заводу ўжо ў трэцім квартале выкананы на 72 проц.

Такому пералому спрыяла ў першую чаргу тое, што поўнасьцю ліквідавана абязьлічка ў рабоце і да мінімуму зьнижаны выпадкі прастою варштатаў. Амаль усе рабочыя заводу ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Камуністы, якія працуюць за варштатам, падаюць сапраўды ўзорныя прыклады бальшавіцкай барацьбы за прамфінплян.

Але-ж гэта яшчэ не азначае, што ў рабоце партыйнай ячэйкі няма недахопаў. Асноўны з іх заключаецца ў тым, што партыйныя сілы па цэхах разьмеркаваны нярэўнамерна, у некаторых зьменах знаходзіцца па адным камуністу, а ў другіх—па 4 і больш. Ячэйка яшчэ шчыльна не падышла да рэалізацыі дырэктыў партыі аб паляпшэньні снабжэньня рабочых, у першую чаргу ўдарнікаў. Завод яшчэ да гэтага часу ня мае свае сталоўкі.

Вельмі слаба ажыцьцяўляецца партыйнае кіраўніцтва работай ячэйкі камсамолу. У сувязі з гэтым сярод камсамольцаў наглядаецца рад хваравітых зьяўішч. Некаторыя з членаў ЛКСМБ ня толькі не зьяўляюцца перадавікамі на вытворчасьці, а цягнуцца ў хвасьце адсталых настрояў. Нават сакратар камсамольскай ячэйкі нядаўна быў занесен на чорную дошку за дрэнную вытворчую работу.

Партыйная ячэйка лесазаводу, правядзячы справаздачна-перавыбарчую кампанію, павінна забясьпечыць перабудову сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі, узмацніць сваё кіраўніцтва камсамолам. Асаблівая ўвага павінна быць аддана рэалізацыі шасьці ўмоў тав. Сталіна і падрыхтоўцы да чацьвертага—заключнага году пяцігодкі.

А. М.

ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНАГА СПЭЦЫЯЛІСТА ТАРФЯНІКА

ІНСТЫТУТ ТОРФУ ПАВІНЕН УДАСКАНАЛІЦЬ ПРОФІЛЬ БУДУЧАГА СПЭЦЫЯЛІСТА, ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ НАВУЧАЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ

Кадры тарфяной прамысловасьці!

З кожным годам узрастаюць тэмпы разьвіцьця тарфяной прамысловасьці БССР. За кошт ужываньня торфу для апалу ў прамысловасьці мы эканомім тысячы кубамэтраў дорага каштуючай драўніны.

Зараз перад намі адкрываюцца шырокія магчымасьці для скарыстаньня торфу ня толькі для апалу, але і для патраб прамысловасьці ў выглядзе здабычы з торфу раду прадметаў высокакаштоўных па сваім значэньні.

Тарфяная прамысловасьць зьяўляецца па, бадай, самай адсталай з усіх галін народнай гаспадаркі ў справе мэханізацыі работ. Але і ў гэтым напрамку за апошнія гады дасягнуты вялізарныя рэзультаты, але задача мэханізацыі ня траціць сваёй актуальнасьці, яна яшчэ павінна вырашацца на працягу бліжэйшых год.

Тарфяны інстытут рыхтуе кадры спэцыялістаў для тарфяной прамысловасьці. Тут, як відзе, адчуваецца востры недахват узброеных найноўшай тэхнікай работнікаў, падрыхтаваных кіраўнікоў для распрацовак і торфазаводаў.

Матар'ял, які мы сёньня зьмяшчаем, паказвае, што ў сыстэме работы інстытуту ёсьць небясьпека невыкананьня дырэктыў партыі аб падрыхтоўцы высока кваліфікаваных кадраў тарфянікаў. Для таго, каб падрыхтаваць спэцыяліста па торфе перш за ўсё трэба пранізаць усе навучальныя праграмы марксызмам-ленінізмам, авладаць мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, увязаць тэорыю з практыкай.

Гэтыя першачарговыя, вялікай важнасьці задачы ў інстытуце ня выконваюцца. Эксплёатацыя балот—асноўная дысцыпліна па падрыхтоўцы тарфяніка — па сутнасьці зьведзена да нуля, яна выкладаецца, як нешта цэлае, непадзельнае. У той час, як гэта дысцыпліна павінна была быць разьбіта па рад цыклаў, у прыватнасьці вывучэньня фрэзэрнай здабычы торфу, гідраэлеватарнай і г. д.

Бяз гэтага ніяк нельга падрыхтаваць вузкага спэцыяліста, работніка, які-б дасканала ведаў сваю справу. А нам зараз іменна патрэбны такія спэцыялісты, а ня людзі, якія ўсяго ведаюць патрошку і ні ў адной галіне ня маюць дасканалых ведаў і падрыхтоўкі.

Той факт, што ў інстытуце ігнаруецца вывучэньне найбольш рацыянальнага, таннага і выгоднага віду здабычы торфу—фрэзэрнага, прымушае нас з усёй вострасьцю паставіць пытаньне аб мэтадах і формах падрыхтоўкі спэцыяліста - тарфяніка. Бясспрэчна, што інстытут пры такім становішчы ігнараваньня вывучэньня найноўшай тэхнікі і дасьледваньня балот, ня можа выканаць ускладзеных на яго задач па падрыхтоўцы кадраў.

Інстытут безадкладна павінен перагледзець свае навучальныя пляны і праграмы, узьняць якасьць выкладаньня па выкананьне задач, якія стаяць перад БНУ і ВТНУ, увязаць вытворчую практыку з нашай сапраўднасьцю, з вывучэньнем найноўшай тэхнікі, якой насычаецца тарфяная прамысловасьць. Рашаючую ролю ў гэтай перабудове павінна адыграць партыйная арганізацыя інстытуту.

Важнейшым вучасткам у падрыхтоўцы кадраў для прамысловасьці зьяўляецца ФЗВ. Фабзавучы падрыхтоўваюць з моладзі шырокія кадры рабочых сярэдняй кваліфікацыі. У сувязі з усё ўзрастаючай патрэбнасьцю ў гэтых кадрах рабочых фабзавучы закліканы вырашыць вялізарную задачу—даць прамысловасьці сотні і тысячы кваліфікаваных рабочых.

У радзе месц недаацэньваецца фабзавуч, як масавая школа па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў для прамысловасьці. Зусім недапушчальнае становішча наглядаецца ў Віцебску, дзе асеньні набор у ФЗВ напалову правален. Дырэкцыі заводаў і фабрык, рэспубліканскіх аб'яднаньняў і трэстаў разам з партыйнымі арганізацыямі адказваюць за падрыхтоўку кадраў, за капітальнае будаўніцтва школ ФЗВ, за забесьпячэньне іх адпаведным абсталяваньнем, навучальнымі прыладамі і г. д.

Партыйныя арганізацыі павінны ўзяць пад свой непасрэдны кантроль работу ФЗВ, прыняць актыўны ўдзел у складаньні для іх неабходных умоў пасьпяховага правядзеньня навучальнага году.

ФЗВ—бесьперабойнае навучаньне!

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

Фабзавучы, як сродак падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў для прамысловасьці, у Віцебску недаацэньваюцца.

Пераважная частка ФЗВ да гэтага часу ня мае адпаведных памяшканьняў для навучаньня і практычнай работы, зьвязанай з выкананьнем навучальных праграм. Дырэкцыі заводаў і фабрык не забясьпечылі нармальных умоў для работы ФЗВ.

ФЗВ швэйнікаў налічвае больш як 500 вучняў. Сотні вучняў ня маючы ніякай магчымасьці змагацца за акадэмічную пасьпяховасьць у сувязі з дрэннымі жыльлёвымі ўмовамі, адсутнасьцю патрэбных габінэтаў, лябараторый, абсталяваньня і г. д.

У ФЗВ Белтэкстыльаб'яднаньня на працягу некалькіх год адбываецца сыстэматычны недабор вучняў. Асноўнай прычынай недабору служыць адсутнасьць школьных будынкаў і абсталяваньня. Тэкстыльная прамысловасьць БССР адчувае востры недахват у рабочых сярэдняй кваліфікацыі. Тэкстыльаб'яднаньне літаральна не прыпяло ніякіх захадаў, каб фарсаваць капітальнае будаўніцтва ФЗВ і тым самым забясьпечыць падрыхтоўку патрэбных кадраў для тэкстыльнай прамысловасьці.

Вырашэньне задачы аб паляпшэньні грамадзкага харчаваньня, паляпшэньні работы сталовак зьвязана перш за ўсё з недахватам высокакваліфікаваных кухараў. ФЗВ куліна-раў павінна кожны год падрыхтоўваць дзесяткі кухараў. Між тым, асеньні набор гэтага году цалкам распушчан, з-за адсутнасьці памяшканьняў.

У радзе ФЗВ і школ масавых прафсэй не адкрыты цэхі, аддзяленьні і ня выкананы заданьні аб кампляктаваньні.

Такое становішча атрымалася дзякуючы таму, што пытаньнем работы ФЗВ не займаецца гарадзкі інспэктарыят Нарасьветы, што ФЗВ недаацэньваюць мясцовыя партыйныя ячэйкі. Рэспубліканскія аб'яднаньні, у веданьні якіх знаходзіцца большасьць віцебскіх ФЗВ, сарвалі капітальнае будаўніцтва і гэтым самым паставілі пад пагрозу посьпех навучальнага году ў ФЗВ.

ЗАРУБЕЖНЫ.

Навейшая тэхніка не вывучаецца

У БССР торф набывае вялізарнае значэньне і ў ім закладзены вялікія магчымасьці для разьвіцьця прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Тарфяны інстытут, які ня так даўно арганізаваўся ў Менску, павінен кожны год даваць краіне сотні высока-кваліфікаваных спэцыялістаў, кіраўнікоў па здабычы торфу.

Дырэкцыя інстытуту і партыйны калектыў яўна недаацэньваюць значэньне інстытуту ў справе падрыхтоўкі кадраў спэцыялістаў. Гэта відаць з таго, што распрацаваныя і прынятыя праграмы зусім не адпавядаюць запатрабаваньням навейшай тэхнікі, не даюць максымуму ведаў будучаму кіраўніку—спэцыялісту—работніку тарфяной прамысловасьці.

У тарфяным інстытуце асноўная дысцыплінай зьяўляецца эксплёатацыя балот. Выкладаньне гэтай дысцыпліны не дае патрэбнага эфэкту. Карта паказаць, што такія пытаньні, як здабыча бокорнага гідраэлеватарнага, транспарцёрна-элеватарнага і фрэзэрнага торфу, не знаходзяць свайго месца ў лекцыях, якія чытаюцца па эксплёатацыі балот.

Шкоднікі ў тарфяной прамысловасьці ўсяк імкнуліся замазаць выгоднасьць фрэзэрнай здабычы торфу, супраціўляліся ўвядзеньню гэтай найбольш карыснай, таннай і эканамічна-выгоднай сыстэмы.

Нам невядома, з якой прычыны дырэкцыя інстытуту ў вытворчую практыку студэнтаў ня ўключыла азнаямленьня і вывучэньня фрэзэрнай здабычы. Пры гэтай сыстэме кожны студэнт павінен дасканала вывучаць трактар, як асноўны рухавік. Між тым, пры вывучэньні трактара выпадае чамусьці такая «дробязь», як вывучэньне рухавіка ўнутранога згараньня, які непасрэдна зьвязан з дзейнасьцю трактара.

У вучэбнай праграме не аддана патрэбнай увагі дысцыпліне аб дасьледваньні балот. Па гэтай дысцыпліне на працягу некалькіх месяцаў студэнты слухалі лекцыі, у якіх ня было нават і простага намёку па сутнасьці работы па вывучэньні балот. Лектар па гэтай дысцыпліне заставаўся да таго часу, пакуль студэнты з абурэньнем не патрабавалі ад адміністрацыі па збавіць іх дарэмнай траты часу.

Работа інстытуту арганізавана так, што большая палова дня ідзе на чаканьне лектараў, якія зьяўляюцца на некалькі гадзін. Якасьць акадэмічнай работы зусім нездавальняючая. Партыйны калектыў і адміністрацыя нічога ня робяць, каб стварыць неабходныя ўмовы для пасьпяховай падрыхтоўкі высока-кваліфікаваных спэцыялістаў для тарфяной прамысловасьці.

Мы лічым, што вучэбная праграма тарфянога інстытуту павінна быць раўнуча перагледжана. У праграмах павінен быць акрэслен профіль будучага спэцыяліста.

Асноўныя дысцыпліны—эксплёатацыя і дасьледваньне балот,—павінны быць значна пашыраны і выкладаньне іх павінна быць пастаўлена так, каб студэнты мелі магчымасьць авладаць апошняй тэхнікай і вывучыць прыродныя багацьці БССР па торфе.

В. Розаў.

Як Наркамфін падрыхтоўвае кадры

Фінансавы апарат БССР адчувае вострую патрэбу ў кваліфікаваных банкаўска - фінансавых работніках. Восеньню гэтага году Наркамфінам адкрыты ўсебеларускія двухгадовыя курсы па падрыхтоўцы фінансавых работнікаў.

Аддзел кадраў НКФ з самага пачатку арганізацыі курсаў не праявіў належнай увагі і ініцыятывы ў справе камплектаваньня, распрацоўцы навучальных праграм і плянаў, падбору патрэбнага кантынгенту слухачоў. У сувязі з гэтым па курсы прынята замест 60 чалавек, толькі 28.

Раённыя фінансава-банкаўскія кіруючыя работнікі па курсы былі выкліканы 1 кастрычніка. Па працягу 45 дзён больш 20 чалавек былі адарваны ад непасрэднай работы і пазбаўлены магчымасьці займацца па курсах. Заняткі па курсах распачаты толькі 15 лістапада. За гэты час Наркамфінам выдаткавана больш як 4.000 руб. на ўтрыманьне курсантаў, якія ідзе не займаліся.

Мы пытаемся, хто вінаваты ў гэтым галавацяпстве?

Работнікі аддзелу кадраў НКФ павінны адказаць за зрыў падрыхтоўкі кадраў для фінансава-кредытных установаў БССР.

М.

БАЛАЗАНАЎ, СЫЦЬКО, СКАЗЛОЎ

Бязьдзейнасьць, якая мяжуе з апартунізмам

(Аб становішчы на эканамічным тэарытычным фронце).

Гісторыя ня ведае такіх прыкладаў разьвіцьця вытворчых сіл і сацыяльных зрухаў, якія адбываюцца ў нашай краіне. Працоўныя масы пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі закапчваюць пабудову падмурку сацыялістычнай эканомікі. Матар'яльная база сацыялізму расьце і мацнее з кожным днём. Пуск гігантаў: АМО, ХТЗ, Магнітагорскага, Кузьнецкага і Уралазаводаў, машынізацыя сельскай гаспадаркі, разьвіцьцё саўгасаў і калгасаў—усё гэта ў корані зьмяняе эканамічны твар нашай краіны.

У цадзявчайна кароткія пэрыяды ў нас адбываюцца зрухі гістарычнага значэньня. Наша эпоха зьяўляецца выключнай па сваёй дынамічнасьці, зьяўляецца эпохай, калі сацыялізм ня ёсьць ужо ідэал далёкай будучыні, калі ён перайшоў «з галіны кніжкі, праграмы—у галіну, якую творыць свайго рукою рабочыя і сяляне» (Ленін).

Гэтыя посьпехі зьяўляюцца вынікам непахіснага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі нашай партыі і сьцьвярджаюць канчатковы гістарычны прыгавор пад контр-рэвалюцыйным трацкізмам і кулацкай агентурай — правым апартунізмам, сьцьвярджаюць правільнасьць генэральнай лініі нашай партыі.

Апошняя стадыя НЭП'у, характэрнай рысай якой зьяўляецца разгорнутае наступленьне сацыялізму па ўсім фронце, высоўвае перад намі цэлы рад задач, якія патрабуюць безадкладнага выраўнаньня праз бальшавіцкія тэмпы работы нашых навукова-дасьледчых установаў.

Задача аўладаньня тахнікай, падрыхтоўка новых кадраў, барацьба за чыстату марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі, змаганьне на дзі фронты (меншавіцтвуючы ідэалізм і мэханіцызм)—вось асноўны баявы напрамак работы нашых навукова - дасьледчых установаў і марксыцкіх таварыстваў. Без ажыцьцяўленьня паказаных задач яны ня будуць зьяўляцца ні валяўнымі, ні марксыцкімі.

У гэтых адносінах па некаторых вучастках працы тэарытычнага фронту справа стаіць ня зусім здавальняюча.

Ажыцьцяўленьне адказных задач на тэарытычным фронце ў галіне тэарытычнай і прыкладной эканомікі, распрацоўка праблем, якія ставяцца пасьпяховым сацыялістычным будаўніцтвам—асноўная работа эканамічных навукова-дасьледчых установаў і арганізацый—ідзе больш чым марудна. Кіраўніцтва таварыства марксыстаў-эканамістаў, інстытуту эканомікі БАН, не ўявілі сабе ўсёй важнасьці і значэньня работы гэтых арганізацый на сучасным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, і не пераключыліся на баявыя, бальшавіцкія тэмпы работы.

Таварыства марксыстаў - эканамістаў, якое павінна змагацца за генэральную лінію партыі ў тэарэтыка-эканамічных праблем БССР, на працягу больш чым двухгадовага свайго існаваньня, кіраўнікі яго толькі думалі аб задачах работы таварыства і ніякай практычнай работы не праводзілі. Зараз чутны галасы з боку паасобных членаў таварыства аб тым, што далейшае яго існаваньне становіцца нэмэтазгодным, што яго патрэбна ліквідаваць, што яно аджыла. Гэта ўстаноўка цалкам увязваецца з апартуністычнай практычнай праўленьня таварыства. Ня трэба гаварыць аб тым, што пры такім становішчы з кругагляду таварыства эканамістаў вынала барацьба на два фронты, якая вядзіцца ўсьцісна на ўсіх вучастках нашай тэарытычнай і практычнай працы.

А можа праўленьне таварыства ліквідаваць змаганьнем з рубіншчынай зьмяшэньне пост фактум заўвагі аб памылковасьці перакладу на белмову падручніка Лапідуса і Астравіцянава?

Да рэчы, гэта—адзінае «актыўнае» выступленьне таварыства ў друку за ўвесь час яго дзейнасьці.

Таварыства не мабілізавала тэарытычных сіл на барацьбу са скажэньнямі марксыцка-ленінскай мэтадалёгіі ў галіне плянаваньня ў БССР (за выключэньнем паасобных таварышоў — Ноткін, Верба і інш.).

Па-за ўвагай таварыства застаўся такі вучастак работы, як падрыхтоўка новых кадраў, узброеных мэтадалёгіяй Маркса - Леніна, у ВНУ і ВТНУ. У той час, як пастаноўка працы катэдр палітэканоміі, тэорыі савецкай гаспадаркі, канкрэтнай эканомікі—зьяўляецца далёка ня бліскучай. Нічога ня зроблена таксама і для рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб масавай школе.

Таварыства ня мела ніякай сувязі з рэдакцыяй адзінага эканамічнага органу ў БССР—часопісьсю «Сацыялістычнае будаўніцтва» (орган Дзяржпляну БССР). У выніку такой работы пяцігадовы плян, кантрольныя лічбы, генэральны плян электрыфікацыі БССР, эканамічнае раёнаваньне, праблема стандарту, арганізацыя працы, гаспадарчы разрахунак, крэдытная рэформа, распрацоўка пытаньняў да складаньня другой пяцігодкі і цэлы рад іншых эканамічных праблем засталіся і застаюцца па-за сферай уплыву таварыства. Такім чынам, таварыства пранікла поўную бязьдзейнасьць, апартунізм.

Адсюль і адрыў таварыства ад шырокай пралетарскай грамадзкасьці, адрыў ад задач, «тэарытычна пастаўленых і практычна вырашаных партыяй» (Сталін). Ня дзіўна пасьля гэтага, што на заводах і фабрыках, у гарадох і раёнах па ведаюць аб існаваньні гэтага таварыства.

***

Навукова-дасьледчы інстытут эканомікі БАН, мабыць не датычыць пастанова ўраду БССР аб задачах БАН і на працягу 8 мес. існаваньня гэтай новай установы работа фактычна амаль не распачата.

Інстытут эканомікі, на які ўскладзена адказная задача—кіраўніцтва навукова-дасьледчай работай у галіне эканомікі, да гэтага часу можа пахваліцца толькі... поўнай бясплянавасьцю, адсутнасьцю бальшавіцкай баязьдзельнасьці. Плян работы складзен з выпадковых пытаньняў. Задачы навукова-дасьледчай работы, вызначаныя пастановай ЦК УсеКП(б) па дакладу Камакадэміі, не знайшлі свайго праламленьня ў дзейнасьці інстытуту.

Праблема плянаваньня і роля сустрэчнага прамфінпляну, новыя формы працы на прадпрыемствах, барацьба і выкрыцьцё буржуазных тэорый сацыял-фашызму, канчатковае выкрыцьцё шкодніцкіх тэорый—не зьяўляюцца стрыжнем працы інстытуту. Між тым у плян уключаны такія праблемы, як «вывучэньне кромня ў БССР» і інш., чым павінен займацца інстытут геалёгіі.

Адной з важнейшых перашкод у працы зьяўляецца сумнозвестная колькасьць навукова - эканамічных кадраў, аднак, і тыя, якія ёсьць, зусім не скарыстоўваюцца інстытутам. Паўнейшая надзея на самацёк у пытаньні падбору людзей характарызуе працу дырэкцыі.

Напружанае становішча з кадрамі эканамістаў, здавалася-б, павінна было прыцягнуць увагу да хутчэйшай і якаснай іх падрыхтоўкі, аднак, інстытут чя цікавіцца ёсам і працай больш як 50 чалавек асьпірантаў-эканамістаў.

Прызнаючы такое становішча на фронце навукова-дасьледчай работы недапушчальным, мы ставім пытаньне аб узмацненьні інстытуту эканомікі, аб ажыцьцяўленьні яго работы.

На грунце бязьдзейнасьці інстытуту плодзіцца тэорыі і ходзяць закулісныя гутаркі аб тым, што мы нібыта «рапа стварылі інстытут эканомікі, замест яго патрэбен зварот да сыстэмы катэдраў». Ці варта даводзіць апартуністычнасьць такіх разважаньняў. Інстытут эканомікі павінен быў плянаваць навукова - дасьледчую працу, зьвязацца цесна з аспірантурай і разам, усім калектывам, распрацоўваць і вырашаць пытаньні, якія ставяцца перад ім партыяй і гігантскім ходам сацыялістычнага будаўніцтва.

***

Такое становішча работы таварыства марксыстаў - эканамістаў і навукова - дасьледчага інстытуту эканомікі БАН не магло не адбіцца на дзейнасьці тэарэтыка - эканамічнай часопісі «Сацыялістычнае будаўніцтва». Нічым іншым нельга вытлумачыць яго слабы тэарытычны ўзровень і несвачасовае рэагаваньне на рад тэарытычных і практычных пытаньняў, якія высоўваюцца сацыялістычным будаўніцтвам.

Мы ставім пытаньне аб далейшай нямэтазгоднасьці існаваньня гэтай часопісі, як органу толькі Дзяржпляну, і аб неабходнасьці зрабіць яе баявым тэарэтыка-эканамічным органам навукова-дасьледчых інстытутаў БАН і Дзяржпляну, які асьвятляў бы новыя праблемы сацыялістычнай рэканструкцыі.

Навукова - дасьледчым установам трэба памятаць, што задача, пастаўленая тав. Сталіным — аб неабходнасьці «ў новых умовах, працаваць па-новаму», датычыць ня толькі прадпрыемстваў, але і навукова-дасьледчых установаў.

Патрэбна зараз-жа зьнішчыць адставаньне тэарытычнай думкі па тэарэтыка-эканамічным фронце БССР, перамагчы адставаньне ад рэчаіснасьці, на якое ўказваў тав. Сталін на канфэрэнцыі аграрнікаў - марксыстаў. Трэба безадкладна ажывіць работу навукова-дасьледчых установаў і павярнуць іх да практыкі сацыялістычнага будаўніцтва, да мас, якія на аснове генэральнай лініі нашай партыі і пад яе кіраўніцтвам будуюць новае жыцьцё.



Новы дом для рабочых швэйнікаў у Гомелі.

БІБЛІЯГРАФІЯ

„Заходняя Беларусь—пляцдарм імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі"—Б. Тарашкевіч

Менск 1931 г. Выданьне каміс'і па вывучэньні Зах. Бел. пры БАН, ст. 20, тыраж 3.000 экз. Цана 15 кап.

Толькі што выйшла з друку і паступіла ў продаж брашура вядомага правадыра нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі, старшыні разгромленай польскім фашызмам стотысячнай Беларускай Сялянскай і Работніцкай Грамады — тав. Браніслава **Тарашкевіча.**

Брашура напісана аўтарам у часе таго кароткага перыяду, калі ён быў вызвалены польскім фашызмам з турмы і знаходзіўся на волі, г. зн. прыблізна ў канцы 1930 г.

За гэты час рэвалюцыйная барацьба рабочых, сялян і ўсіх прыгнечаных польскім імпэрыялізмам народаў супроць польскага імпэрыялізму, супроць акупацыі, супроць буржуазіі і вамешчыкаў, барацьба, на чале якой стаіць камуністычная партыя,—**значна заваструлася і паглыбілася** як ва ўсёй Польшчы, таксама і ў Заходняй Беларусі. Сьведчыць аб гэтым рад масавых баявых забастовак (Дамброва, Варшава, Беласток, Горадня, Ільня і інш.), як і рад рэвалюцыйных дэманстрацый і выступленьняў рабочых, беспрацоўных і сялян.

Ня толькі сяляне Заходняй Украіны перакапаліся, што «пан добры толькі печаны» і «пусьцілі такого чырвонага пеўня па памешчыцкіх сядзібах, што зрабілася горача і ў самой Варшаве». Ужо і ў Заходняй Беларусі штораз яр чэй разгараецца полымя стыхійных сялянскіх выступленьняў. Гараць маёнткі, гараць кулацкія двары. Мноства зямакі на цягніку. Штораз часьцей вачаюцца трупамі з вёсак дэфэнзыўныя каты. Лёзунг КПЗБ «ні гроша падаткаў ураду голаду, беспрацоўя, тэрору і вайны» **пачынае быць баявой праграмай дзеяньня шырокіх мас працоўнага сялянства.** Барацьба супроць акупантаў пачынае набываць штораз вастрэйшыя формы. І па нагібель фашысцкай дыктатуры, пад кіраўніцтвам заартаванай у полымі клясавых баёў КПЗБ, гэтыя **стыхійныя выступленьні** ператвараюцца ў магутнае рэвалюцыйнае **арганізаванае наступленьне** па ўсім фронце.

Цяпер у сувязі з падзеямі на Далёкім Усходзе і агульным завастрэньнем міжнароднай сітуацыі польскі фашызм распачаў асабліва інтэнсыўную падрыхтоўку да антысавецкага паходу. Апошняя паездка Пілсудзкага ў Румынію, як вядома, закончылася тым, што польскі маршал стаў **генэралісімусам аб'яднанай польска-румынскай арміі.** Сойм па сваёй апошняй сэсіі зноў ухваліў **рад ваенных законаў,** з якіх важнейшым зьяўляецца закон аб мілітарызацыі чыгункі і аб **зьняцьці мытаў з імпарту ваеннай прадукцыі.** Усё гэта факты, якія маюць **непасрэдне** дачыненьне да ўзмоцненай падрыхтоўкі вайны.

І ў гэтай імкнна сітуацыі брашура тав. **Тарашкевіча** набывае асабліва палітычнае значэньне. Чырвоная ніткай праз усю брашуру праходзіць выкрыцьцё палітыкі польскага фашызму, палітыкі падрыхтоўкі імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі супроць СССР. Аўтар робіць гэта падзвычай сьмела, з глыбокімі палітычнымі высновамі.

Брашура тав. **Тарашкевіча** каштоўна асабліва тым, што яна на падставе аналізу **канкрэтнай палітычнай сітуацыі канца** 1930 году даюгул правільна ставіць праблему антысавецкай інтэрвэнцыі з боку міжнароднага і польскага імпэрыялізму, правільна паказвае тую ролю, якую пры гэтым адыгрываюць **беларускія нацыянал-фашысты і нацыянал-дэмакраты.**

Таксама рашуча і сьмела тав. **Тарашкевіч** дэмаскуе манэўр польскага фашызму, чым зьяўлялася датэрміновае вызваленьне з турмы выдатнейшых грамадаўцаў, дэмаскуе як імкненьне пілсудзкіх заправіл «дэзарыентаваць масы і дыскрэдытаваць вызваленых, каб перад масамі зрабіць выгляд, што фашысцкая нацыянальная палітыка мяняецца ў ліберальны бок, а асуджаных прымусіць маўчаць».

Гэты манэўр фашызму з трэскам праваліўся. Звольненыя з турмы грамадаўцы не замаўчалі. Яны сказалі масам, выкрылі перад імі тое, што пад пагрозай шматгадовай катаргі загадаў таіць польскі фашызм.

«Перад тварам мас, ва ўмовах абвостранай акупацыі, дзікага разгулу тэрору, вызваленыя з турмы грамадаўцы загаварылі сваёй ранейшай рэвалюцыйнай мовай, асуджаючы акупацыю, падрыхтоўку вайны, супроць СССР, контр-рэвалюцыйную ролю агентуры польскага імпэрыялізму—беларускага нацыянал-фашызму і нацыянал-дэмакратаў».

Завяршыліся, як ашпараныя гады —польскі фашызм і беларускі нацыянал-фашызм. Для іх выступленьне правадыроў Грамады было нечаканым і аглушаючым ударам. З пенай на губах завылі, ахопленыя панікай Луцкевічы, Астроўскія, Акінчыцы і к°, якіх т. **Тарашкевіч** здэмаскаваў, як «прымазаўшыхся да грамадаўскага руху для таго, каб яго ўнутры дэзарганізаваць», як тых, якія «цяпер зьяўляюцца кіраўнікамі галоўнага атраду беларускага нацыянал-фашызму і застрэльшчыкамі самага агіднага паклёпу супроць СССР і супроць рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі».

Падоўга тав. **Тарашкевічу** прышлося быць на волі. Дэфэнзыва не магла даравацъ, каб такі небясьпечны для іх клясавы вораг, як ён, вырваўся з яе рук. Як вядома, 6-га лютага 1931 г. на пагранічнай станцыі Ўчаў польская дэфэнзыва па-бандыцку схапіла тав. Тарашкевіча ў транзітным цягніку, ламаючы ўсякія «міжнародныя законы».

Хутка мінае 5 год ад часу разгрому грамады польскім фашызмам.

І сёньня, ня гледзячы на тое, што Грамада разгромлена, непераможны нацыянальна-вызваленчы рух рабочых і сялян, **варны рэвалюцыйным традыцыям Грамады, жыве і ўзмацняецца з кожным днём.** Падыходзяць дні рашаючых сутыкненьняў з дыктатурай польскага фашызму.

Недалёкі той час, калі на сьпеках польскіх Бастыляй ударыць вал пераможнай пралетарскай рэвалюцыі і вызваліць 10.000 лепшых сыноў рабочасялянскай сям'і, у тым ліку і Тарашкевіча, і Валошына і іншых правадыроў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Брашура тав. **Тарашкевіча** падзвычайна важны палітычны дакумант. Устаноўкі і думкі, выказаныя ў гэтай брашуры, зьяўляюцца ўстаноўкамі і думкамі ўсяго рэвалюцыйнага нацыянал-вызваленчага руху, які моцна стаіць на пазыцыях барацьбы з польскім імпэрыялізмам, руху, які ўзначальваецца камуністычнай партыяй і праводзіцца ў цеснай сувязі з рэвалюцыйнай барацьбой рабочых і сялян усёй Польшчы.

З брашурай правадыра Грамады павінен пазнаёміцца кожны партыец, кожны камсамолец, кожны рабочы-ўдарнік і калгасьнік-актывіст.

Прайшло толькі некалькі дзён, як брашура выйшла з друку і ўжо ў кнігарнях яе няма, яна раскуплена. Гэта сьведчыць аб тай зацікаўленасьці барацьбой панных заходніх братоў, якую праяўляюць працоўныя Савецкай Беларусі. І таму прыходзіцца шкадаваць, што такую каштоўную брашуру БАН выдала **толькі** ў 3.000 экзэмплярах. Брашуру Тарашкевіча трэба **зараз-жа перавыдаць масавым шматтысячным выданьнем.** Трэба даць магчымасьць прачытаць яе самым шырокім колам нашых чытачоў.

В. Т.

УСТАНАВІЦЬ СТРОГІ КАНТРОЛЬ

за якасьцю ільнавалакна

УЗМАЦНІЎШЫ ТЭМПЫ ПЕРААПРАЦОЎКІ І ЗАГАТОВАК, ВЕСЬЦІ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З ІМКНЕНЬНЕМ КУЛАЦКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРАК ЗДАЦЬ ДЗЯРЖАВЕ НЕДААПРАЦАВАНЫ ЛЁН

ТРАПАНЬНЕ ІЛЬНУ—ЦЭНТРАЛЬНАЕ ЗЬВЯНО ПЕРААПРАЦОЎКІ

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 3 лістапада прапававаў «Калгасцэнтру, райкомам і райвыканкомам зараз-жа прыступіць да практычнай арганізацыі работ па апрацоўцы ільну і канапель у калгасах на аснове зьдзельшчыны, брыгаднага спосабу апрацоўкі і шырокага ўкараненьня сацыялістычных мэтадаў працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва».

Дырэктывы даны выразныя і катэгарычныя. Пераапрацоўка ільну і канапель і загатоўка таварнай прадукцыі ставіцца, як адна з важнейшых задач побач з загатоўкамі збожжа, мяса і бульбы. Ад пасьпяховага выкананьня гэтай задачы залежыць далейшы бурны рост лёгкай індустрыі, паляпшэньне рабочага забесьпячэньня.

Гэту палітычна-гаспадарчую задачу некаторыя кіруючыя раённыя арганізацыі недаацанілі. На 10 лістапада 25 раёнаў (у тым ліку 5 ільнаводчых) не пачалі яшчэ пераапрацоўкі ільну.

У гэты-ж час такія раёны, як Кармянскі, Буда-Кашалёўскі, Рагачоўскі, Любанькі, Чавускі, Вузьдзенскі, ужо пераапрацавалі ад 40 да 71 проц. ільнасалёны. Гэтыя раёны і некаторыя іншыя паказваюць сапраўды бальшавіцкія тэмпы барацьбы за лён па адказнейшым вучастку пераапрацоўкі, бо ад гэтага залежыць посьпех і загатовак.

Рашаючае значэньне ў барацьбе за лён маюць якасныя паказальнікі. З усёй рашучасьцю трэба адзначыць, што гэты вучастак—найбольш пагражаючы ў пераважнай колькасьці раёнаў. Дзяржава ў гэтым годзе павінна атрымаць толькі трапаны лён. Трапаньне недапушчальна адстае ад мяцьця.

З 11,3 проц. зьмятага ільну па 10 лістапада атрапана толькі 3,8 проц. У гэтым адзін з сур'ёзных тормазаў загатовак. Ніякіх аб'ектыўных прычын тут няма. Толькі няўменьнем арганізаваць работу можна вытлумачыць такое ганебнае зьявішча.

Там, дзе барацьбу за якасьць пабальшавіцку арганізавалі, трапаньне ідзе разам з мяцьцём. Яркі прыклад—Чавускі раён, у якім увесь зьмяты лён атрапаны (46,9 проц.).

Тэмпы пераапрацоўкі павінны быць рашуча ўзьняты. Разрыў паміж мяцьцём і трапаньнем неабходна і можна ліквідаваць неадкладна.

Аналізуючы работу па Сіроцінскім раёне, «Зьвязда» ўжо паказала спосабы для зьнішчэньня гэтага разрыву.

Ганебным прыкладам ігнараваньня якасьці прадукцыі зьяўляецца практыка загатоўчых арганізацый у Бабруйскім раёне, дзе сярод загатоўленага сырцу 25-30 проц. няпрыгоднай для прадукцыі прамысловасьці.

Рэдакцыі таксама вядомы і такія ганебныя факты, як распараджэньне райспабу Крупскага раёну «прымаць лён сырцом, інакш буду прыцягваць да адказнасьці» і на Бярэзінскім раёне, дзе з санкцыі РВК скарысталі на мясцовыя патрэбы алей, прызначаны на прэміраваньне здатчыкаў прадукцыі тэхкультур.

На падставе выразных дырэктыў партыі аб пераапрацоўцы ільну і загатоўках трэба разьвіць узмоцненую работу па хутчэйшым выкананьні плянаў, непарыўна зьвязваючы яе з павышэньнем якасьці прадукцыі. Правільнае і сваячасовае выкананьне гэтай задачы мае вялікае значэньне як для далейшага разгортваньня тэкстыльнай прамысловасьці, а разам з гэтым паляпшэньня работага снабжэньня, так і для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня ільнаводчых калгасаў.

Зводка аб ходзе першапачатковай апрацоўкі ільну (мяцьця, трапаньне) на 10-ХІ 1931 г.

РАЁНЫ	Прамята	Пратрапана
1. Брагінскі	40,5	—
2. Б.-Кашалёўскі	54,3	—
3. Бабруйскі	40,7	—
4. Веткаўскі	11,7	—
5. Глускі	—	—
6. Гомельскі	12,9	10,3
7. Жыткавіцкі	5,0	1,9
8. Жлобінскі	—	—
9. Кармянскі	71,3	—
10. Камарынскі	—	—
11. Ельскі	21,2	10,4
12. Лоеўскі	—	—
13. Любаньскі	43,7	29,3
14. Лельчыцкі	11,3	—
15. Мазырскі	9,9	—
16. Нараўлянскі	—	—
17. Парыцкі	—	—
18. Пінскі	—	—
19. Рагачоўскі	50,8	44,5
20. Рэчыцкі	—	—
21. Слуцкі	5,8	3,6
22. Старобінскі	—	—
23. Старадарожскі	—	—
24. Тураўскі	—	—
25. Перахаўскі	8,7	5,8
26. Чачэрскі	—	—
27. Чырвонапольскі	2,6	1,9
28. Чырвонапольскі	—	—
29. Уваравіцкі	18,9	—
30. Хойніцкі	—	—
31. Асіпавіцкі	11,1	—
32. Быхаўскі	37,2	—
33. Барысаўскі	12,6	12,6
34. Бялыніцкі	43,7	—
35. Бягомльскі	—	—
36. Бярэзінскі	39,3	36,6
37. Горацкі	0,6	—
38. Заслаўскі	34,2	2,7
39. Клімавіцкі	1,5	1,3
40. Крупскі	3,5	—
41. Капыльскі	22,4	—
42. Касьцюковіцкі	7,7	—
43. Клічаўскі	—	—
44. Кодланаўскі	6,0	—
45. Крычаўскі	13,2	10,3
46. Лагойскі	—	—
47. Магілёўскі	16,2	—
48. Мсьціслаўскі	6,4	0,9
49. Менскі	—	—
50. Прапойскі	9,6	9,4
51. Пухавіцкі	—	—
52. Плешчаніцкі	—	—
53. Смалявіцкі	29,5	—
54. Талачынскі	12,5	11,7
55. Чэрвеньскі	12,5	—
56. Чавускі	46,9	46,9
57. Чэрыкаўскі	7,2	0,7
58. Шклоўскі	28,9	14,4
59. Вузьдзенскі	41,1	12,8
60. Асьвейскі	0,8	0,2
61. Аршанскі	9,4	—
62. Бешанковіцкі	—	—
63. Віцебскі	3,2	—
64. Вушацкі	4,0	—
65. Гарадоцкі	3,1	1,6
66. Дубровенскі	8,9	0,5
67. Дрысенскі	3,3	0,5
68. Лёзьнянскі	10,6	9,4
69. Лепельскі	—	—
70. Полацкі	—	—
71. Расонскі	—	—
72. Сураскі	—	—
73. Сенненскі	9,2	—
74. Сіроцінскі	17,6	1,5
75. Чашніцкі	0,8	—
Па БССР	**11,3**	**3,8**

Раўняцца па калгасах Калышанскага сельсавету

ЛЁЗНА. Калгасы і аднаасобныя бядпацка-серадняцкія гаспадаркі Калышанскага сельсавету ўключыліся ва ўсебеларускі конкурс па пераапрацоўцы і здачы ільну дзяржаве. У калгасах арганізаваны ўдарныя брыгады, паміж якімі разгорнута сацспаборніцтва.

У выніку на 5-га лістапада па калгасах здана 316 цэнтн. валакна, аднаасобнікамі—75 цэнтн., а разам—391 цэнтн., што складае 30 проц. гадавога пляну на сельсавеце.

Калгасы «Ільліч» і «Чырвоны пуцілавец» ужо скончылі апрацоўку ільну і поўнасьцю здалі яго дзяржаве.

Ідуць наперадзе па апрацоўцы ільну калгасы **«Авангард», імя Сталіна, «3-ці рашаючы», імя Калініна.** Асабліва добрай якасьцю адзначаецца прадукцыя ільну па калгасах **«Авангард», імя Калініна і «3-ці рашаючы».**

Ганебна адстае калгас **«Прафінтэрн»,** які з 117 гэктараў ільну не апрацаваў яшчэ ніводнага цэнтнэра. У гэтым калгасе ня ўвесь лён абмалочаны і шмат знаходзіцца на сьцеліцы.

І. Якаўлеў.

Паход за 1.000.000 тон сіласу

ЯШЧЭ НЯ СКОНЧАН

АДКІДЫ ГАРОДНІНЫ, НЯСКОШАНАЯ АТАВА І ЛІСЬЦЕ, ПРАМЁРЗЛЫЯ КОРАНЬПЛОДЫ ЦАЛКАМ ПАВІННЫ БЫЦЬ СКАРЫСТАНЫ НА КОРМ

Завяршыць сіласаваньне ў парадку баявога штурму

Аршанскі і Талочынскі раёны першымі ў БССР выканалі плян сіласаваньня, з перавышэньнем на 7 проц.

Шэсьць раёнаў—**Чачэрскі, Койдаўскі, Мсьціслаўскі, Віцебскі, Сеньненскі і Лёзьнянскі**—ажыцьцявілі ўжо больш 3/4 сваёй праграмы і набліжаюцца да перамогі на гэтым важнейшым вучастку барацьбы за стварэньне кармавой базы.

Аднак, **БССР у цэлым,** з прычыны недапушчальнага адставаньня значнай часткі раёнаў, **выканала толькі 38,6 проц. заданьня.** Засіласавана 386 тысяч тон масы.

Гэта праўда, у некалькі раз перавышае колькасьць масы, засіласаванай летась, але зусім не забясьпечвае патрэбы бурна ўзрастаючай сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў кармах.

Многія раённыя арганізацыі і асабліва зямельна-калгасная сыстэма яшчэ не ўсьвядомілі вялізарнага палітычна-гаспадарчага значэньня барацьбы за адзін мільён тон сіласу. Яны гэты адстаючы вучастак не падцягваюць, ня прымаюць належных арганізацыйна-масавых мер, каб да наступленьня зімы навярстаць упушчанае. Даволі адзначыць, што саўгасы далі ўсяго 32,3 проц. заданьня. Калгасы, хаця і выканалі 61 проц. пляну, але таксама запоўнілі час не праяўляюць патрэбнага тэмпаў, каб хутка закончыць кампанію.

Злачынна ігнаруюць сіласаваньне Веткаўскі, Лельчыцкі, Пятрыкоўскі, Церахаўскі, Хойніцкі, Быхаўскі, Бярэзінскі, Чавускі, Вузьдзенскі раёны. Яны ажыцьцявілі сваю праграму толькі ад 10 да 20 проц. Больш 10 раёнаў трымаюцца на ўзроўні ад 20 да 30 проц.

Апартуністы з зямельна-калгасных арганізацый гэтых раёнаў «скончылі» сіласаваньне ў сувязі «з марозамі, якія пачнуцца ў бліжэйшыя дні». Між тым, адыходы гародніны, нясконшаная атава, прымёрзшыя коранплоды і іншыя прадукты гінуць марна.

Са злачынай бязьдзейнасьцю ў скарыстаньні наяўных рэсурсаў для сіласу павінна быць рашуча пакончана. **Сіласаваць ёсьць што. Ёсьць і рабочая сіла.** Мабілізаваўшы масы рабочых саўгасаў і калгасьнікаў, на аснове самаспаборніцтва і ўдарніцтва можна ў парадку баявога штурму завяршыць сіласаваньне, выканаць 100 проц. пляну.

Плян выкананы толькі на 30 проц.

ВУШАЧЫ. (Ад наш. спэцкора).

У Вушацкім раёне налічваюцца 44 жывёлагадоўчыя фэрмы: 15 МКТФ, 12 СКТФ і 17 фэрм па гадаваньні маладняка. Надыходзячыя халады ставяць перад раённымі арганізацыямі важнейшую задачу—пастаўіць жывёлу ў належныя ўмовы зімоўкі. Адным з асноўных пытаньняў зьяўляецца забесьпячэньне жывёлы кармамі на ўвесь стойлавы перыяд.

Работа кіруючых і зямельна-калгасных арганізацый у гэтым напрамку ня можа быць прызнана задавальняючай. **Сапраўды бальшавіцкай барацьбы за кармовую базу ў раёне не адчуваецца.**

Замест таго, каб энэргічна ствараць кармовую базу за лён выяўленьня і скарыстаньня ўсіх унутраных рэсурсаў, мясцовыя апартуністы склалі рукі, чакаючы... **«далейшых падзей».**

Яркай ілюстрацыяй служаць адносіны да сіласаваньня. Райкалгасаюз і МТС не падхапілі заклікі камуны «Зьвязда», Пухавіцкага раёну, аб арганізацыі ўдарнага дня сіласаваньня. Нічога ня зроблена, каб дабіцца поўнай перамогі на гэтым фронце. Наадварот, гэтыя арганізацыі лічаць, што выкананыя Вушацкім раёнам 30 проц. пляну—гэта і ёсьць рэальныя магчымасьці раёну, а нявыкананыя 70 процантаў зьяўляюцца «нерэальнымі выдумкамі цэнтру».

П. Арцёльны.

Сьвінсаўгасы не забіраюць кармоў

Саўгасы Сьвінаводу адчуваюць патрэбу ў канцэнтраваных кармох. Між тым многія з іх ня прымаюць ніякіх захадаў у гэтым напрамку. Больш таго, саўгас **«Старая Беліца»,** у якім амаль няма канцэнтраваных кармоў, сваячасова не разгрузіў прыбыўшыя ў яго адрас макуху і авёс, і гэтыя карма прадаў з таргоў.

Саўгас **«Вішнёўка»,** які мае ў Менску свайго спэцыяльнага агента і грузавую машыну, таксама сваячасова не разгрузіў вагон вотрубей.

Беларускі Сьвінаводтрост ня прымае рашучых мер супроць вінаватых дырэктароў саўгасаў. Трэба з усёй жорсткасьцю ўдарыць па галаваногах. За несваячасовую выгрузку неабходна прыцягваць да суровай адказнасьці.

БелТА.

Да суровай адказнасьці

Прэзыдыум Менскага гарадзкога савету адзначыў, што нездавальняючы ход сіласаваньня па раёне (выканана 40 проц. заданьня) зьяўляецца вынікам слабага кіраўніцтва гэтай работай з боку загадчыка земчасткі тав. Якубовіча.

За зрыў сіласаваньня пастаноўлена прыцягнуць да судовай адказнасьці загадчыкаў саўгасу «Заціша» і «Вішнёўка», бульбяной станцыі і кіраўніцтва тых калгасаў, дзе плян выканан менш чым на 30 проц. Прэзыдыум гарсавету пастанавіў таксама аддаць пад суд загадчыкаў тых гаспадарак, якія сарвалі плян будаўніцтва сіласных вежаў. (БелТА).

Па СССР

Новы спосаб выпрацоўкі рафінаду,

які зробіць рэвалюцыю ў цукраварафінадным прамысловасьці

ХАРКАЎ, 17. Інжынэр Валахвінскі вынайшоў новы спосаб выпрацоўкі рафінаду, які зробіць рэвалюцыю ў цукрова-рафінадным прамысловасьці. Дагэтуль рафінад атрымліваўся шляхам перапрацоўкі цукровага піску. Валахвінскі даказаў магчымасьць выпрацоўкі рафінаду непасрэдна з бурачнага сыроцу. Першы спосаб радыкальна спрасьціць вытварэньне рафінаду, знаходзіць на панізіць выдаткаваньне вугалю і працы, зберажэ мільёны руб. І ўзьніме савецкую цукрова-рафінадную прамысловасьць на яшчэ больш высокую ступень. Спосаб інжынэра Валахвінскага ўжо перавераны Украінскім Навукова-Даследчым Інстытутам цукровай прамысловасьці і выпрабаваны ў заводзкім маштабе на Арцёмаўскім цукрова-рафінадным заводзе. У выніку атрымаў рафінад высокай якасьці.

СКЛАД КАМІТЭТУ ПА ДАПАМОЗЕ ПРЫ СНА

МАСКВА, 17. Савет Працы і Абароны зацьвердзіў наступны склад камітэту па дапамозе пры СНА: т. т. Куйбышаў (стар. пляна камітэту), Лежаў (пам. старшыні), Міронаў (ЦКПС), Касіёр (ВСНГ), Лобаў (Наркамснаб) — члены камітэту.

20-га сьнежня адкрываецца 2-я сэсія ЦВК СССР

2-я сэсія ЦВК СССР 6-га скліканьня пазначаецца на 20-га сьнежня 1931 г. у гор. Маскве. Парадак дня:

1. Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі СССР на 1932 г.
2. а) Адзіны [illegible] плян і адзіны [illegible] СССР на 1932 г.
б) Судакладзі бюджэтнай камісіі ЦВК СССР аб адзіным фінансавым пляне і адзіным [illegible] на 1932 год.
3. Дакл[illegible] урэду [illegible] СССР.
4. Аб зацьвярдж[illegible] прадпрыемстваў прэзыдыумам ЦВК СССР і падлягаючых на падставе арт. 18 канстытуцыі СССР зацьвярджэньню сесіі ЦВК СССР.

Сакратар ЦВК СССР

ЕНУКІЗЗЭ.

Хлеб, людзі, якасьць

Міх. Кін

Дамочнік цеставода тав. РАДЗЮК. НА ЗДЫМКУ: Майстра тав. БУРАК,

«Абавязаць усе партыйныя, прафэсыянальныя, савецкія і кааперацыйныя арганізацыі паставіць работу па паляпшэньні якасьці прадукцыі, як адну з важнейшых задач...».

(З пастановы Кастрычніцкага пленуму ЦК УсесКП(б).

— Як хлеб?...

— Паляць...

Такі кароткі дыялёг можна часта чуць на менскім хлебазаводзе. Гэта значыць, што качагарка дае печам вельмі высокую тэмпэратуру, а спажывец будзе есьці падгарэлы хлеб.

Качагарка — важнейшае зьвяно. Але справа ня толькі ў ёй.

Завод павінен даць добраякасны стандартны хлеб. Скромны термін «стандарт» вядомы кожнаму хлебапёку. Нестандартны хлеб ва многіх выпадках значыць брак, а брак зьядае сыроц. рабочую энэргію, б'е па рэальнай зарплаце. Барацьба за стандарт —барацьба за якасьць.

— Што патрэбна для таго, каб хлеб быў добрым і смачным?

Кісл[illegible] ад 9 да 12 проц.
Вільготнасьці—да 48 »
Порыстасьці—ня ніжэй 42 »
Тэхналягічн. апрацоўкі—100 »

Гэтыя паказальнікі зьяўляюцца цэнтрам у барацьбе за якасьць. У лінеі стандартнасьць хлеба дасягала ўсяго 23 проц. Ударнікі, пад кіраўніцтвам партыйнай і прафэсыянальнай арганізацый, вывелі завод на шлях перамогі. Завод дасягнуў 88 проц. стандарту. Барацьба за 100 проц. не аслабляецца.

***

Каля высокіх масыўнай печы стаіць высокі сухарлявы чалавек у белай спэцоўцы. Ён гаворыць горача, махаючы рукамі, нешта даказваючы. Гэта — **Буран Пётра Васільлевіч, старшы майстар і брыгадзір другой брыгады,** прэміраваны ўдарнік.

— Так нельга здымаць з поду, хлеб псуецца—паказвае Пётра Васільлевіч аднаму з рабочых.

Завод дае штодзенна 65 тон хлеба. Кожныя 8 гадзін — 9 тысяч булак. Барацьба за якасьць прадукцыі становіцца цэнтральнай задачай усяго калектыву. І па дзіва, спажывец скарыстаў, хлебазавод выплачвае каапэратыўні дзесяткі тысяч рублёў рэфакцыі (штрафу) за выпуск нестандартнага хлеба.

За апошнія дзьве дэкады атрыманы першыя перамогі. У першых радох барацьбітоў за добры і смачны хлеб — другая ўдарная брыгада, на чале якой тав. Бурак.

Таварыша Бурака ведае ўвесь завод. Ён сапраўдны дырэктар сваёй зьмены. Цалкам урос у вытворчае жыцьцё печнага залі Бурак любіць і ведае сваю справу. Аб сабе ён гаворыць мала, але кіраўніцтва прадпрыемствам, грамадзкія арганізацыі ведаюць яму цану.

Біяграфія. Гісторыя жыцьця тав. Бурака не складаная і яе можна расказаць за некалькі хвілін. Працуе з малецтва, на вытворчасьці 23 гады. Майстарства хлебапёка прайшоў у шматлікіх пякарнях гаспадарыкаў, з якімі меў не адну сутычку.

— Што можна аб сабе сказаць? Працуе так, як патрабуе гэтага завод. Падаў заяву ў партыю, бо зразумеў, што месца кожнага сьвядомага пралетара толькі ў радох партыі.

Бураку доўга гутарыць некалі, бо кожную хвіліну яго адрываюць па розных пытаньнях.

Майстар гапарыцца сваёй брыгадай.

— Кожны рабочы нашай брыгады праяўляе максымум зацікаўленасьці да работы. Інакш нельга змагацца за якасьць.

Бурак не адзін, Буракоў на заводзе шмат і ўсе разам яны складаюць адну магутна згуртаваную масу. 88 проц. добраякаснага хлеба — першая буйная перамога. Цеставод Кац, яго памочнік **Радзюк,** зьмешчык Костка, чорнарабочы **Петрашкевіч**—усе яны з 2-й брыгады. Некаторыя з іх не адзін раз прэміраваны.

Другая брыгада паказвае ўзоры ўдарнай работы і лічыцца па праве адной з лепшых. Аб гэтым красамоўна гаворыць калёнка лічбаў у пахавых бюлетэнях. За першую дэкаду лістапада вытворчае заданьне выканана на 105 процантаў, на якасьці — на 91 проц., брак зьнижан да 0,14 проц. А вось рапартычка за 13 лістапада. Другая брыгада выпекла 10.878 булак, трэцяя брыгада — 8.800, чацьвертая—9.680. Другая брыгада за 13 лістапада выпекла звыш заданьня 1.230 булак.

— Як дабіліся посьпехаў?

— Першай задачай, якую мы перад сабой паставілі, было тое, каб 6 ухоў тав. Сталіна дайшлі да сьвядомасьці кожнага рабочага.

Прамфінплян давядзен да кожнага рабочага. Каб ліквідаваць абязьлічку і бездапушчасьць, усе ўдарнікі брыгады замацаваны за поўнай машынай і працэсам. У машыны «Юста» заўсёды тав. Лютэрман. Кожную хвіліну «Юст» выкідвае 17 кавалкаў песта па 1.500 грам, а печ патрабуе 25 кавалкаў. Каб ня было паўзадзі ў рабоце канвэера, Лютэрман павінен асгатняй 8 кавалкаў падкідваць рукамі. Тут патрабуецца спрактыкаванасьць і спрытнасьць. Самы пазначны прохах пшыце канвэер. Цеставод тав. Кац адказвае за работу цестамясільнага цэху, затое каб квасы ня былі запараны, а вагары цестамясілак працавалі бесьперабойна, кожны рабочы цэху прымацаваны да поўнай мясілкі.

Брыгада сваячасова рэагуе на «вузкія» месцы, па ўсё тое, што перашкаджае выкананьню пляну, бічуе прагульшчыкаў, сьмылянтаў — канкрэтных посьбітаў усякіх няўвязак. Там, дзе гэта трэба, старэйшы майстар аказвае дапамогу справай і парадай.

У рабоце хлебазаводу і ў самой брыгадзе ёсьць і хібы. Дровы часта сырыя, мука даецца нявылежаная. Гэта б'е па якасьці. Не хапае квасільных чанаў.

Экспэдыцыя — «могілкі для хлеба», як кажуць некаторыя рабочыя. Пазнішаньне не прыстасавана для цяперашніх тэмпаў заводу. Гарачы хлеб часта зваліваецца ў адну кучу, псуецца. Брыгада Буракова не змагаецца яшчэ як належыць за сапраўдны гаспадарчы разрахунак, за зьдзельшчыну.

***

Другая брыгада пераможна пасе сьцяг сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Ад 23 проц. стандарту да 91 проц.—вось яе шлях. Але ў іншых брыгадах барацьба за якасьць і стандарт ня стала яшчэ ў цэнтры ўвагі. Спажывец справядліва абураецца тым, што ў хлебе часта бываюць такія рэчы, як вяроўкі, шкло і г. д. Хлеб часам бывае то сыры, то прыгарэлы.

Раўняючыся па перадавіках з другой брыгады, увесь калектыў хлебазаводу пойдзе, як майстар Буран, цеставод Кац, як Петрашкевіч, змагацца за добраякасны, смачны хлеб.

На фальсыфікатарах--жорсткі ўдар

БАБРУЙСК.

Далейшае разгортваньне лёгкай індустрыі цесна зьвязана з пасьпяховым выкананьнем плянаў загатовак тэхкультур. Барацьба за якасьць прадукцыі зьяўляецца цэнтральнай задачай у ільнавенька-загатоўках гэтага году. Аб важнасьці барацьбы за якасьць «Зьвязда» пісала ня раз.

Між тым, гэты вучастак зьяўляецца найбольш адсталым у рабоце некаторых ільнаводчых раёнаў. Так, па Бабруйскім раёне загатоўчыя арганізацыі пры прыёмцы ільну адносяцца злачынна няўважліва да якасьці прадукцыі. У выніку **сярод загатоўленага ільну—25-30 проц. зусім нягоднага для прамысловасьці.**

Бесконтрольнасьцю загатоўчых арганізацый карыстаюцца кулацка-заможныя гаспадаркі, якія наўмысьля здаюць фальсыфікаваны лён.

Здача падмочанага валакна, з дрэннай павязкай трасты, або грубымі вяроўкамі, з кастрыцай, глінай, каменьнямі ўнутры вязак—нярэдкія зьявішчы па загатоўчых пунктах Бабруйскага раёну.

Загатоўчы апарат не пераведзен на прэміяльна - прагрэсыўную сыстэму. Аплата работнікаў усё яшчэ не знаходзіцца ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці загатоўленай прадукцыі. Белкаапсаюз павінен несьці непасрэдную адказнасьць за несваячасовае выкананьне дырэктыў партыі аб пераводзе загатоўчага апарату на зьдзельна-прэміяльную сыстэму, за ігнараваньне барацьбы за якасьць таварнай прадукцыі.

Недапушчальным зьяўляецца і тое, што па раённых загатоўчых складах ляжыць больш за 70 тон загатоўленага валакна, якое не адпраўляецца на нарадах для прамысловасьці.

(Белта).

Японскі ўрад санкцыянаваў захват Паўночнай Манчжурыі

пачаліся новыя баі за Цыцыкар

Антысавецкія правакацыі ня спыняюцца

Заява японскага консула ў Мукдэне

ТОКІЕ, 17. Генэральны консул Японіі ў Мукдэне—**Хаясі**, які прыбыў у Токіё, у інтэрв'ю паўтарыў сваю заяву адносна таго, што **ня можа быць і гутаркі аб эвакуацыі японскіх войск з Манчжурыі** ў даны момант, улічваючы, што парадак у Манчжурыі падтрымліваецца выключна японскімі войскамі. На пытаньне аб тым, ці сапраўды Савецкі ўрад аказвае дапамогу генэралу Ма, Хаясі адказаў:

«Я нічога пя ведаю, але ясна толькі адно: войскі генэрала Ма паказвае такую дысцыплінаванасьць, якую ніколі нельга было назіраць у кітайскіх войсках. Вядома таксама, што ў сучасны момант войскі генэрала Ма ўладаюць зэнітнымі гарматамі, якіх раней яны ніколі ня мелі. Як відаць, за спіною генэрала Ма стаіць нейкая буйная сіла».

Японская ваеншчына абурана адказам генэрала Ма

ТОКІЕ, 17. У Мукдэне апублікавана дэкларацыя камандуючага японскімі акупацыйнымі войскамі Хандзіо. У дэкларацыі гаворыцца, што паводле данясеньня японскай ваеннай місіі з Харбіна, адказ генэрала Ма паступіў сёньня ў поўдзень — на дзень пазьней вызначанага тэрміну. Генэрал Ма заяўляе, што ён адвядзе сваё войска толькі ў выпадку эвакуацыі японскіх войск з раёну ракі Ноньні.

Далей,—гаворыцца,—у дэкларацыі, — генэрал Ма патрабуе гарантыі ў тым, што японскія войскі не дазволяць Чай Хай-певу карыстацца Таонань-Ананцынскай чыгункай, і толькі ў гэтым выпадку ён са свайго боку гарантуе бясьпеку руху па гэтай чыгунцы.

У заключэньне Хандзіо у сваёй дэкларацыі адначае, што «адначасова з гэтым адказам Ма, апошні ўзмацніў войска на першай лініі фронту і чакае зручнага моманту, каб нанесьці ўдар японскім войскам. (ТАСС).

Наглы паклёп падпальшчыкаў вайны

ТОКІЕ. Японскае агенцтва «Сімбун Рэнго» пашырае далей хлусьлівыя і правакацыйныя чуткі аб падтрыманьні, якое быццам аказваецца СССР кітайскім войскам. Агенцтва паведамляе: «**Паводле вестак са станцыі Манчжурыі, 11 лістапада, у 2 гадзіны дня, на станцыю Манчжурыя прыбыў цягнік з чырвоным войскам, у складзе якога знаходзяцца кітайскія і карэйскія камуністы. Цяпнік зараз-жа накіраваўся на станцыю Ананьцзі.**

Хейлуцзянскія войскі выкапалі акопы ўздоўж лініі КУЧ у раёне станцыі Ананьцзі на працягу 5 міль. Акопы забясьпечаны 30 палявымі гарматамі, вялікай колькасьцю гаўбіц і 200 кулямётамі. Генэрал Ма накараў сьмерцю 500 салдат, якія дэзэртавалі з мосту на рацэ Ноньні».

Японцы арганізоўваюць белагвардзейскую „дзяржаву“

ПАРЫЖ, 16. Паводле паведамленьня белагвардзейскага друку, «у колах украінскай дырэкторыі ў Бэрліне атрыман ліст ад атамана Сямёнава. Апошні паведамляе, што **японцы прапанавалі яму стварыць будучую адміністрацыйную ўладу Усурыйскага краю, які японцы маюць намер ператварыць у буфэрную Казацкую дзяржаву**».

Пасылка бомбавозаў у Манчжурыю

ТОКІЕ, 16. Японскае агенцтва «Сімбун Рэнго» паведамляе, што ў сувязі з магчымасьцю вайны ў паўночнай Манчжурыі ў бліжэйшыя дні, ваеннае міністэрства, улічваючы, што папаўненьні сухаэмных войск Японіі не пасьпеюць прыбыць на месца, **пасылае ў Манчжурыю бомбавозы.**

Амэрыканскае агенцтва абвяргае антысавецкую хлусьню

НЬЮ-ЁРК, 17. Амэрыканскае агенцтва «Юнайтэд прэс» распаўсюджвае тэлеграму свайго спэцкора **Фрыдэрыка Ку**, які выехаў праз СССР у Манчжурыю для азнаямленьня на месцы са становішчам японска-кітайскага канфлікту. Ку піша:

«Падарожжа вашага карэспандэнта па Сібіры, асабліва праезд па савецкай тэрыторыі каля манчжурскай граніцы паказалі **поўную хлусьлівасьць чутак аб канцэнтрацыі чырвоных войск ля кітайскай мяжы. На вялікім сібірскім шляху не заўважаны ніякія прыметы ваенных перакідак.** Цягнікі ідуць зусім дакладна паводле раскладу. **На станцыях бачыш менш салдат, чым у большасьці эўрапэйскіх краін**».

Парыскія біржавікі прагнуць крыві

ПАРЫЖ. Орган французкай кампартыі «**Юманітэ**» піша:

«У той час, калі Японія пашырае акупацыю ў Манчжурыі, на парыскай біржы ў чаканьні ваеннай канъюнктуры» адбіваецца павышэньне цэн, у прыватнасьці цэн на мэталь. Біржавы лісток «Сіцюасьён эканомік эфінансьер» 15 лістапада адкрыта растлумачваў павышэньне цэн «**рэзультатам ваенных падрыхтовак Японіі і яшчэ сяго-таго**». «Мы навінны сказаць, — піша орган парыскай біржы, — што **вайна ў Манчжурыі ці нават проста пашырэньне японскай акупацыі будуць садзейнічаць павышэньню цэн на сырцовыя матар'ялы.** Паўсюды і заўсёды дзейныя арміі зьяўляюцца важнымі фактарамі спажываньня. Апрача таго, мабілізаваныя зьнімаюцца з вытворчасьці. **З эканамічнага пункту погляду падобныя фактары, калі яны толькі атрымаюць сапраўднае разьвіцьцё, дапамогуць зьменшыць залежны запасаў сырцу**».

«Юманітэ» заклікае да мабілізацыі мас супроць «разбойнікаў біржы і капіталу, якія падтрымліваюцца сацыял-фашыстамі» і да выступленьняў **на абарону СССР і кітайскай рэвалюцыі і супроць імпэрыялістычнай вайны.**

Пасылка войск з карэннай Японіі

ТОКІЕ, 18. Як паведамляе газэта «Асахі» рада міністраў, азнаёміўшыся з дакладам Мінамі (вайсковы міністар) прыняла наступнае: 1. дзеянні генэрала Ма недапушчальныя і Японія павінна ўжыць адпаведныя меры ў адносінах да Ма; 2. — Неабходна апублікаваць зараз-жа «дэкларацыю» да ўсяго сьвету, для растлумачэньня таго, што Японія ня хоча вайны, аднак, прымушана зьвярнуцца **да падобных мер** у мэтах самаабароны; 3. З прычыны таго, што паяўныя японскія сілы ў Манчжурыі невыстарчальныя, дык зусім магчыма, што ўзьнікае неабходнасьць пасылкі новых папаўненьняў з карэннай Японіі.

***

ТОКІЕ, 18. Вайсковы міністар Японіі Мінамі і міністар замежных спраў Сідэхара, у рэзультаце некалькіх нарад, прышлі да заключэньня, што адзіным сродкам «устанаўленьня міра» ў Паўночнай Манчжурыі зьяўляецца «вытнаньне з Паўночнай Манчжурыі генэрала Ма». Вакацукі — прэм'ер міністар ухваліў прынятую пастанову. У рэзультаце ваеннага ўлада інструктавала генэрала Хандзіо — начальніка акупацыйнай арміі — ужыць «неабходныя меры».

Баі ў раёне Ноні

ТОКІЕ, 18. Як паведамляе спэцыяльны карэспандэнт газэты «Асакі», з Мукдэну ў раёне Ноні пачаліся сутычкі між галоўнымі сіламі японскіх і кітайскіх войск. Ваенны міністар пацьвярджае гэтыя весткі, заяўляючы: «Войскі генэрала Ма пачалі наступленьне 17-га лістапада ноччу». Цяпер японскае войска занята «ажыць пяўленьнем контрмер».

(ТАСС).

СПЭЦЫЯЛЬНАЯ ПАЗЫКА ДЛЯ ВЯДЗЕНЬНЯ ВАЙНЫ

ТОКІЕ, 18. Газэта «Ніцы-Ніцы» піша, што ўрад падрыхтоўвае выпуск спэцыяльнай пазыкі для пакрыцьця ваенных выдаткаў у Манчжурыі ў надыходзячым бюджэтным годзе.

(ТАСС).

У рабочых раёнах Бэрліну

4.484.000 беспрацоўных. Дапамогі атрымліваюць толькі 2.500.000. Звыш 4.000.000 працуюць скарочаны тыдзень. На вытворчасьці занята ўсяго 50,1 проц. усёй рабочай клясы Германіі. 800.000 беспрацоўнай моладзі. Зарплата складае 50 проц. афіцыяльнага пражытачнага мінімуму.

Такавы лічбы.

Яны гаворяць красамоўней цэлых томаў аб беднаце, галечы, голадзе, бязьлітаснай экспляётацыі, пячувальным прыгнечаньні германскага пралетарыяту. Яны больш пераконваюць, чым самае яркае апісаньне пакут шматмільённага працоўнага народу, усе жыцьцёвыя сілы якога высмоктваюцца вэрсальскімі дралежнікамі і рурскімі, рэйнскімі, вэстфальскімі, бэрлінскімі і сілескімі капіталістамі.

Але хто-ж яны, гэтыя мільёны безназоўных гарнякоў, мэталістаў, тэкстыльшчыц, партавікоў? Як жывуць яны, спадзяючыся на зорку новага жыцьця, ці паміраюць, страціўшы веру ва ўсё—у лепшае будучае, у свабоду, справядлівасьць?

***

Пэтэр Шэфэр ужо два гады беспрацоўны. Ён да жыцьця атрымліваў крызісную дапамогу, але цяпер гэту дапамогу адабралі ад яго. Яго пісьмовая заява аб аказаньні яму дапамогі з добрачынных фондаў адхілена на тэй падставе, што з ім жыве падчарка, якая зарабляе 14 марак (марка каля 50 кап.) у тыдзень. Няхай яна ўтрымлівае яго. Яго жонка тэкстыльшчыца Марта Шэфэр — таксама беспрацоўная. Яна хворая — каса выдала адпаведнае пасьведчаньне — і таму яна атрымлівае з добрачынных фондаў 36 марак у месяц.

***

Марыя Зэпэль працуе 24 гады на заводзе «Осрам», на ім вырабляюцца электрычныя лямпкі. Яна ўжо даўно ўдава і павінна была сама выкарміць трох дзяцей. Калі з гадамі цяжкая праца рабілася не пад сілу, яна марыла аб тым, што дзеці вырастуць, стануць на працу і дадуць ёй магчымасьць адпачыць. Але дзеці вырасьлі і... сталі беспрацоўнымі. Няма ніякай надзеі, што хутка можна будзе пакінуць завод і даць адпачыць старым рукам.

Зэпэль працуе зьдзельна ў люстравым цэху. Праца цяжкая, шкодная для лёгкіх, а ва ўдавы Зэпэль астма. Але гэтым ніхто ня цікавіцца. У цэху канвэрная сыстэма і яна ня можа адставаць. Але дзе-ж ёй дагнаць маладых работніц — і то добра, калі ёй удасца зарабіць 17 марак у тыдзень. Але як-жа пражыць на гэтыя грашы? Чэцьвера? Як зьвесьці канцы з канцамі?

Першым у чарзе — замужнія і старыя работніцы. Рэфармісткі заўком, праўда, адмаўляе гэта, але работніцы самі бачылі ўжо сьпісы там наверсе — у заўкоме.

24 гады цяжкай працы, голаду, клопатаў — і вось 53-гадовая Марыя Зэпэль стаіць перад тым-жа, што і 24 гады таму назад,—перад зданьню голаду. Ужо тры месяцы за кватэру ня плачана, хутка яна з дзецьмі будзе выкінута на вуліцу.

Голад, галеча, пагроза быць выкінутай з кватэры — усё гэта дакапала Марыю Зэпэль. Яна стамілася жыць і стамілася галадаць.

24 гады Марыя Зэпэль была членам прафсаюзу мэталістаў. Усе гэтыя гады яна актыўна дапамагала сваёй арганізацыі, зьбіраючы ў цэху прафсаюзныя ўзносы. Чэрэз стагодзьдзя яна была членам сацыял - дэмакратычнай партыі. Што-ж дала ёй гэта партыя? Нічога, апрача беспрасьветнага жыцьця і жорсткай сьмерці. Яна спыніла сваё працоўнае жыцьцё іржавым кухонным нажом.

***

Фрыда Шмідт, штампоўшчыца, працуе на электразаводзе канцэрну АЭГ. Цэх працуе ўсяго толькі 2 дні ў тыдзень, і за мінулы тыдзень Фрыда прынесла дамоў усяго 8 з пал. марак. З іх яна заплаціла свае ўзносы ў страхкасу на беспрацоўі і на жыцьцё ў яе засталося ўсяго 5 марак. За кватэру трэба заплаціць 33 маркі ў месяц, але дзе-ж іх узяць? Фрыда здала-б свой пакой і жыла-б у кухні, але ў яе няма ложка, а хто-ж возьме пакой бяз ложка? Яна купіла ў растэрміноўку канапу, абавязаўшыся выплачваць па 2 маркі ў тыдзень, але ў яе і гэтых марак ня было, і цяпер на яе падалі ў суд. А за кватэру таксама ня плочана ўжо цэлых 5 месяцаў—і гаспадар пагражае высяленьнем. Яна даўно памерла-б з голаду, калі-б прыяцелі ня прыносілі ёй жыўнасьці.

Фрыда Шмідт ня бачыла выхаду. **Праца і голад—толькі праца і голад** — дзеля гэтага ня варта жыць, — парашыла яна. Фрыда адчыніла газавы ражок.

***

На заводах канцэрну Сімэнса дырэкцыя дадумалася да асобна - цынічнага спосабу паменшэньня зарплаты: зьніжэньне робіцца ня ўсюды адразу, а па чарзе — спачатку ў адным цэху, пасьля ў другім. Так лягчэй заглушыць хваляваньні сярод рабочых. На электразаводзе канцэрну «Кабэльвэрке» — у цэху «93» зьдзельная работа выдаецца без расцэнак.

Увядзеньне зьдзельшчыны прывяло ва ўсіх цэхах да ўсеагульнага зьніжэньня зарплаты. У цэху «23» таго-ж «Кабэльвэрке» працуючыя там маладыя работніцы зарабляюць ня больш 5 марак у тыдзень. «Вы ўсё яшчэ зараблянце вельмі многа», — заявіў нядаўна калькулятар і правёў новае зьніжэньне зарплаты.

На другім заводзе канцэрну «Вэрнэрвэрке» працуюць пяць дзён у тыдзень. Работніцы зарабляюць усяго ад 8 да 9 марак. Многія работніцы працуюць там больш 20 год, але і яны атрымліваюць ня больш 38 пфэнігаў у гадзіну. У выпрабавальным цэху «Шальтвэрке» працуюць 4 дні ў тыдзень. Тыднёвы заработак рабочага складае ад 9 да 15 марак. Іншы раз зарплата выдаецца ўсяго за тры дні, хоць працуюць 4 дні. Рабочыя чапляюцца і за гэтыя грашы—усё лепш, чым беспрацоўе. Але і ад беспрацоўя нельга ўхіляцца. У апошнія дні па заводах канцэрну, посыпца чуткі аб будучых масавых звальненьнях. Гавораць аб тым, што будуць зволены 12.000 рабочых—амаль трэцяя частка ўсіх рабочых канцэрну Сімэнса. Рабочыя баяцца і падумаць, што тады з імі будзе? Што будзе? **У Бэрліне 500.000 беспрацоўных**, якія атрымліваюць жабрацкую дапамогу. Яшчэ столькі-ж беспрацоўных зусім не атрымліваюць дапамогі. Надыходзіць халодная і галодная зіма.

Расьце абурэньне шырокіх працоўных мас супроць ураду Брюнінга — ураду 48-га параграфу. Рабочыя масамі пакідаюць рады сацыял-лёкаяў і пераходзяць пад сьцягі кампартыі. Пад кіраўніцтвам слаўнай камуністычнай партыі, пралетарыят Нямеччыны энэргічна рыхтуецца да рашучых баёў супроць дыктатуры капіталу, за Савецкую Нямеччыну.

М. ПЕРНІК.

БУРНЫ МІТЫНГ БАСТУЮЧЫХ ТРАМВАЙШЧЫКАЎ У ВАРШАВЕ

ФАШЫСЦКАЯ ПРЭСА Б'Е ТРЫВОГУ

Дэзарганізацыйная работа сацыял-фашыстаў

ВАРШАВА, 17. Сёньня раніцою ў галоўных трамвайных майстэрнях адбыўся бурны мітынг бастуючых рабочых і служачых варшаўскага трамваю. На мітынгу прысутнічала больш 3.000 чалавек. Ня гледзячы на старанныя згодніцкіх «правадыроў», рабочыя аднадушна выказаліся за сьпіненьне работы, патрабуючы стабілізацыі ставак зарплаты на ліпеньскім узроўні. Паводле даных, магістрат, улічваючы сур'ёзную пагрозу пашырэньня забастоўкі, прапануе рабочым трамваю прыняць верасьнёўскія стаўкі, якія ніжэй ліпеньскіх на 4,5 проц.

Вячэрні **«Кур'ер чэрвоны»** б'е трывогу ў сувязі з забастовачнымі настроямі камунальных рабочых і дамагаецца, каб магістрат пайшоў на ўступкі і неадкладна ліквідаваў канфлікт.

«Кур'ер чэрвоны» піша: «Неабходна памятаць, што калі сёньня бастуюць толькі 5.500 гарадзкіх рабочых, дык заўтра могуць далучыцца да забастоўкі 2.000 рабочых вадаправоду, пасьлязаўтра — 700 рабочых газавага заводу і г. д.» «Кур'ер чэрвоны» ўказвае, што адзіным якарам ратунку зьяўляецца пасярэдніцтва ўрадавых органаў.

Сацыял-фашысцкія прафсаюзы прымазваюцца да забастоўкі. За сьпіной рабочых і забастовачнага камітэту прафсаюзы яваруўшчыкаў і ППС вядуць бесьперапынныя перагаворы з магістратам. Становішча надзвычай напружанае. **Трамвайныя майстэрні ахоўваюцца ўзмоцненымі паліцэйскімі пастамі, узброенымі вінтоўкамі.**

(ТАСС).

Наперакор ваенна-палявым судам,

наперакор нячуванай мабілізацыі паліцыі і ахранкі—

РАБОЧЫЯ МІТЫНГІ І ДЭМАНСТРАЦЫІ АДБЫВАЛІСЯ У 14 ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІКА ПА УСЕЙ ПОЛЬШЧЫ

БЭРЛІН, 17. Весткі, атрыманыя з вялікім спазьненьнем з Варшавы, даюць малюнак сьвяткаваньня 14-й гадавіны Кастрычніка ў Польшчы. У Варшаве напярэдадні Кастрычніцкай гадавіны адбыўся рад мітынгаў на фабрыках і чыгуначных майстэрнях. На буйным мэталюргічным заводзе Норбліна адбыўся мітынг пры ўдзеле амаль усіх рабочых заводу. З прамовай выступіў камуністычны дэпутат **тав. Данецкі**, які заклікаў рабочых да абароны ачагу сусьветнай рэвалюцыі — Савецкага Саюзу. Паліцыя прабавала разагнаць мітынг і ізаляваць ад рабочых прамоўцу. Рабочыя здолелі абараніць тав. Данецкага і давесьці мітынг да канца.

На мітынгу ў галоўных чыгуначных майстэрнях у рабочым прадмесьці брала ўдзел каля 1.000 рабочых чыгуначнікаў. З прамоваю аб значэньні 14-ай гадавіны Кастрычніка, аб унутраным становішчы Польшчы, аб мілітарызацыі чыгунак і г. д. выступіў камуністычны дэпутат **тав. Рожэк.** На ўдзельнікаў мітынгу напаў прыбыўшы атрад паліцыі. 4 рабочых былі арыштаваны. Паміж паліцыяй і чыгуначнікамі, якія прабавалі адбіць арыштаваных, адбылася бурная сутычка.

7-га лістапада ў рабочым раёне Варшавы — **Воля** — адбыўся мітынг, на якім выступаў камдэпутат **тав. Рожэк.** Апрача таго, мітынгі і дэманстрацыі адбыліся і ў іншых рабочых раёнах. Дэманстрацыі ўсюды суправаджаліся сутычкамі з паліцыяй, якая разганяла рабочых гумавымі дубінкамі, шаблямі і прыкладамі. Праведзены шматлікія арышты. Спробы арганізаваць дэманстрацыю, якія ня ўдаліся толькі з прычыны **нячуванай мабілізацыі паліцыі і ахранкі**, сьведчылі аб баявых настроях рабочых мас, што змагаюцца за свае правы на вуліцу, наперакор ваенна-палявым судам.

На працягу 5-га, 6-га і 7-га лістапада **ў Лодзі было арыштавана звыш 500 чал.**, прычым арышты адбываліся ня толькі па прыватных кватэрах, але і непасрэдна па фабрыках і біржах працы. Арыштаваны між іншым поўнасьцю ЦК левых нямецкіх сацыял-дэмакратаў (антыфашысцкая арганізацыя).

Для росту рэвалюцыйных настроў польскай арміі характэрным зьяўляецца наступны факт. Камандзір 31-га пяхотнага палка, які расквартаваны ў Лодзі, скінуў запасных салдат, загадваючы ім са зброяй у руках выступіць супроць рабочых-дэманстрантаў. **Ні адзін з прысутных салдат на выканаў загаду.** З прычыны гэтага камандваньне строга ізалявала казармы, значна ўзмацніўшы іх ахову.

Характэрна, што фашысцкая і сацыял-фашысцкая прэса абыйшла ўсе гэтыя факты моўчкі, як вады ў рот набраўшы.

Папянскі дамагаецца вызваленьня

ВАРШАВА, 16. Паводле вестак, якія мы маем, арганізатар замаху на выбух савецкага паўпраўства ў Варшаве і яго абаронца зьвярнуліся з хадайніцтвам аб пераглядзе пастановы апэляцыйнага суда. Як вядома, апэляцыйны суд скасаваў прыгавар акруговага суда, паводле якога Папянскі быў асуджан да 10 год катаргі, і замяніў яе 3 гадамі папраўчай турмы з залікам адбытага Папянскім турэмнага зьняволеньня. Паводле заявы Гофмюль-Астроўскага Папянскі мае намер дамагацца поўнага свайго апраўданьня.

Антысавецкае „турнэ“ белабандыта Булак-Балаховіча

ВАРШАВА, 16. Вядомы «атаман» разгромленых бандыцкіх зграй з Беларусі, які праславіўся сваімі яўрэйскімі патромамі ў часе савецка-польскай вайны, Булак-Балаховіч аб'яжджае ў сучасны момант гарады Вальні з дакладамі на тэму: «Ці будзе вайна». Булак-Балаховіч, які лічыцца, між іншымі генэраламі польскай арміі ў запасе, падрыхтоўвае сваіх слухачоў да «нямінучасьці вайны, бо Польшча акружана з усіх бакоў ворагамі, і найзьлейшым яе ворагам зьяўляецца камунізм».

ПАГРОМНАЯ ХВАЛЯ Ў ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ ПАШЫРАЕЦЦА

ВАРШАВА, 17. Наперакор запэўненням фашысцкага ўраду, хваля яўрэйскіх пагромаў ва ўсёй Польшчы з кожным днём пашыраецца. Хуліганскія напады фашысцкіх сынкоў польскай буржуазіі на працоўныя масы і яўрэйскую беднату адбываюцца ў Варшаве, Львове, Кракаве, Пазнані, Саснoўцы, Ломжы і Вільні.

Узброеныя палкамі і каменьнямі, студэнты-палякі выкідваюць студэнтаў-яўрэяў з унівэрсытэцкіх будынкаў, паладжваюць паходы па вуліцах, выбіваючы па дарозе шыбы, разьбіваючы яўрэйскія крамы і зьбіваючы прахожых яўрэяў.

У пагромныя выступленьні ўцягнута таксама **моладзь сярэдніх школ**, так што нават няпоўнагадовыя бяруць удзел у нападах на яўрэяў. Адначасова кідаецца ў вочы імкненьне ўцягнуць у антысэмітскія выступленьні мясцовыя хуліганскія элемэнты.

Для фашысцкай дыктатуры яўрэйскія пагромы зьяўляюцца вельмі своечасовымі, бо адцягваюць увагу і абурэньне мас ад сапраўдных вінаватых у катастрафічнай сітуацыі польскай гаспадаркі.

Паліцыя ўсюды трымаецца пасыўна, або наадварот, падтрымлівае пагромшчыкаў, а ў Вільні, як падае «Газэта Варшаўска» ў нумары 346—**нават афіцэры дапамагалі студэнтам.**

Фашысты розных адценьняў падтрымліваюць яўрэйскія пагромы. Для становішча польскіх сацыял-фашыстаў характэрным зьяўляецца той факт, што пэнэсаўскія дэпутаты ўхіліліся ад удзелу ў соймавай дыскусіі па справе яўрэйскіх пагромаў з мэтай унікнуць адкрытага выяўленьня сваіх адносін да гэтага пытаньня.

Польскія, яўрэйскія, украінскія і беларускія пралетары добра ведаюць, што пагромы і карныя экспэдыцыі зьяўляюцца ланцугом аднэй кампаніі, пачатай фашысцкай дыктатурай для задушэньня рэвалюцыйнага руху і вытраваньня збанкрутаванага польскага капіталізму. Працоўныя масы нацыянальных меншасьцяй, якія стогнуць пад ботам польскіх акупантаў, добра ведаюць, што толькі супольная з польскім пралетарыятам рэвалюцыйная барацьба супроць капіталізму, за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры, за савецкую Польшчу зьяўляецца адзіна сапраўднай зброяй супроць яўрэйскіх пагромаў.

Сумнае прызнаньне

У «Газэце Варшаўска» № 331 вядомы фашысцкі пісьменьнік Адольф Навачынскі падае такі малюнак сучаснай фашысцкай Польшчы:

Мы канчаткова зьяўляемся адчыўшымі людзьмі, няшчаснымі парыямі, кулі, фоляхамі, абарванцамі. Нашы гарады — гэта бруд і смурод. Нашы шосы і гасьцінцы — вэртэпы. Нашы шпіталі і клінікі — агіда, смурод. Для насельніцтва, якое значна павялічылася, няма памяшканьняў. Старыя дамы разваліваюцца, новыя ня будуюцца. Самае мінімальнае спажываньне пукру, масла, малака, віна і... ботаў. Большая частка насельніцтва ў краіне ходзіць зусім босая. На 1.000 чалавек 300 ходзяць бяз ботаў, і ня маюць дзе жыць».

Да гэтай характарыстыкі сучаснай фашысцкай Польшчы няма чаго больш і дадаваць.

Паведамленьні

— **Культпроп ГК** прапануе прапрацаваць у сетцы партасьветы на працягу 2-х дэкад наступныя тэмы: 1) Народна-гаспадарчы плян IV кварталу. 2) Перавыбары прафгрупаў (увязаўшы з гутаркай § 11. 3) Аб становішчы і заданьнях чыгуначнага транспарту. 4) Пытаньне савецкага гандлю (увязаўшы з гутаркай § 12). 5) Аб ходзе загатовак. Мэтад распрацоўкі ў Культпропе Гаркому КП(б)Б.

— 20 лістапада, у 6 гадз. веч., у залі пасяджэньня ЦК склікаецца нарада кіраўнікоў аддзелаў кадраў і адказных па вуноце кадраў (камуністаў) наркаматаў і цэнтральных установ, на якой ступныя пытаньні: 1) Аб правядзеньні номэнклатурнай сыстэмы ў разьмеркаваньні кадраў. 2) Аб падрыхтоўцы да Усебеларускай парады па кадрах. Яўка абавязкова без спазьненьня.

Адказны рэдактар **М. ГАРЫН.**

Падпісвайцеся сваячасова на сьнежань

і далейшыя месяцы

на цэнтральны орган КП(б)Б—газэту

„ЗЬВЯЗДА“

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: на 1 мес.—1 р., 3 мес.—3 руб., 6 мес.—6 руб., на год—12 р.

ПАДПІСКА НА СЬНЕЖАНЬ ПОШТАЙ БУДЗЕ ПРЫМАЦЦА ТОЛЬКІ ДА 26 ЛІСТАПАДА

Не адкладвайце здачу падпіскі на апошні дзень!

Чырв. Зорка Пач. 6, 8-20, 10-30 — Гаварашчы гукавы фільм **ЗЛАТЫЯ ГОРЫ**

„КУЛЬТУРА“ Пач. 7, 8-45, 10-30 — 1) Вялікая бяда Невялікай жанчыны 2) Электрозавод культурфільм

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“ Адкр. з 12 г. дня — 1) Мастацкае кіно-п'еса **СУСЬВЕТНАЕ ІМЯ** 2) Кіно-нарыс № 59 Саюзкіно

ПРАЛЕТАРЫ — Бостэр Кітон **АПАНТАНЫ** у 6 ч. Звыш праграмы **БАЛКАШ** у 2 ч.

„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“) — Два фільмы ў адзін сэанс 1) Мост праз Вып 2) Палявальнік на Гарылу Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.

„СПАРТАК“ Каса адкрыта з 5 г. — З чацьверга, 19 лістапада прыгодніцкі фільм **Шчасьлівы Кент** драма ў 6 ч. Пачатакі 1—7.15, 2—9 і 3—10.30.

ТВМДБ Сёньня лістапада, у 7 г. у Доме Кадраў адбудзецца працяг абгаварання філёзоўскіх твораў т. Вальфсона С. Я. Запрашаюцца: партыйны і беспартыйны актыў і навуковыя працаўнікі. ТВМД.

Навуковая асацыяцыя дактароў і Бел. Дзярж. Інстытут удасканаленьня мэдычных кадраў. **ЛЕКЦЫЯ-ДАКЛАД** праф. **ХАЛАТАВА.** „Сучаснае становішча пытаньня аб артэрыосклерозе“ адбудзецца ў аўдыторыі клінікі Нэрвовых хвароб 19 лістапада г. г. у 8 пал. гадз. веч.

20 ЛІСТАПАДА, у 6 гадз. веч., у памяшк. фізычнай аўдыторыі БДУ адбудзецца **пасяджэньне фізыка-матэматычнай асацыяцыі БАН,** прысьвечанай памяці **ФАРАДЭЯ і ЭДЫСОНА.** Дакладчыкі т. т. **УСЬПЕНСКІ і НЕКРАШЭВІЧ.** Запрашаюцца навуковыя і інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі, рабочыя, студэнты і ўсе жадаючыя.

СХОД Т-ВА АГРАРНІКАЎ-МАРКСІСТАЎ 20-XI-31 г., у 7 гадз. веч., у памяшк. ІІДі сав. рэмаструкцыям с. г. (Шырокая, 20) склікаецца ПРАДРЫК ДНЯ: 1. Аб арганізацыйна-гаспадарчым заданьні. 2. Выборы мэсцовых, абласных і ўсесаюзнага з'ездаў. Абавязкова яўка ўсіх экспэрыментатараў-аграрнікаў і практычных працаўнікоў Наркамзему, Калгасцэнтру і іншых.

ОБЩЕСТВО ПРОЛЕТАРСКОГО ОПТЭ ТУРИЗМА И ЭКСКУРСИЙ.

АПЭР.-ЭКС. СЭКТАР ЦС „ОПТЭ“ АРГАНІЗУЕ ПАДАРОЖЖЫ ПА УСІХ РАЁНАХ СССР ПА АБМЕНЕ ВЫТВОРЧЫМ ВОПЫТАМ паміж прамысловымі прадпрыемствамі, саўгасамі, калгасамі і МТС і па вывучэньні сац. будаўніцтва і краязнаўства.

Турыстам прадастаўляецца ільготны чыгуначны (водны) праезд, харчаваньне, інтэрнат і культабслугоўваньне.

Запіс і даведкі ў краявых і абласных саветах „ОПТЭ“.

Падрабязнасьці ў спэцыяльных праспэктах і дведніках.

фота-апарат— НА СЛУЖБУ САЦ. БУДАЎНІЦТВА.

Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА УСІХ ПРАЦОЎНЫХ, ШТО АШЧАДКАСАМІ БССР ПРАВОДЗІЦЦА **РЭАЛІЗАЦЫЯ ФОТААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ,** па якіх трымальнікі апошняга змогуць атрымаць фотаапараты тыпу „ФОТОКОР“ № 1, разьмерам 9х12 з адпаведнымі прыладамі.

КОШТ ФОТААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА: 1, 2, 3 сэрый—220 руб.)—(4, 5, 6 і 7—187 руб.

Кошт фотаабавязацельства ўплачваецца ў растэрміноўку да 1-XII—33 г. у залежнасьці ад сэрыі.

Выдача фота-апаратаў пачынаецца з 1-VII—32 г. Рэалізацыя фотаабавязацельстваў будзе праводзіцца да 1 красавіка 1932 г.

Кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР.

Просьба да ўсіх курсантаў, скончыўшых ГОМЕЛЬСКУЮ САУПАРТШКОЛУ, даслаць у школу свае адрасы, якія неабходны для пераадпраўкі прыбываючай на іх імя карэспандэнцыі і выпісаных імі кнігоў. Заг. школы **БАЛЮНЕВІЧ.**

Беларускаму аб'яднаньню „БЕЛУЦІЛЬ“ **ПАТРЭБНЫ** для работы ў Менску вопытны работнік кіраўнічых кваліфікацыі: **нач. галоўнага бухгальтара або бухгальтар - інструктар планавік-эканомыст, спэцыяліст па ўцілізацыі і паўшай жывёлы** са спэцыяльнай адукацыяй работніці, якія добра ведаюць уцільную справу, **два статыстыкі і адна машыністка,** якая добра ведае беларуск. мову. АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ. Праезд за кошт аб'яднаньня. Заявы з адбіткамі правоўных сьпісаў або іншых дакумантаў накіроўваць у сэктар кадраў аб'яднаньня Белуціль, г. Менск, Козьма-Дзямьянаўская № 9 тэл. № 16-31.

Беларускі дзяржаўны мэдычны інстытут абвяшчае прыём НА 1-шы КУРС **ВЯЧ. ФАКУЛЬТЭТУ.** На санітарна-прафілактычнае аддзяленьне—60 асобахматмладш.—30, лечпраф.—30. Правілы прыёму, як і для ўсіх вузаў (даведнік НКА на 1930-31 г.). Прыём заяў да 15-XII—31 г. Іспыты з 15-XII па 25-XII. Заняткі з 1-I—32 г. Студэнты вячэрняга факультэту стыпэндыяй і інтэрнатам не забясьпечваюцца. Даведні аб паступленьні выдаюцца штодзённа ў канцылярыі Інстытуту з 4 да 5 гадз. дня. Дырэкцыя мэдінстытуту.

20 ЛІСТАПАДА ПАЧЫНАЮЦЦА **заняткі ў Беларускім Філіяле Ўсесаюзнага Антырэлігійнага Унівэрсытэту па радыё.** Працягваецца прыём заяў на ўсе чатыры аддзяленьні: масавае, нацыянальнае, прапагандысцкае і лектарскае. За інструктыўным матар'ялам і анкетамі неабходна зварочвацца ў мясцовыя раённыя і гарадзкія саветы Вакуўнічых Бязбожнікаў. 21 лістапада ў фізычным корпусе Унівэрсытэцкага Гарадка у 6 з палов. гадзін вечара пачынаюцца заняткі ў Менскім Антырэлігійным Рабочым Унівэрсытэце. Усе запісваўшыя таварышы паміны зьяўіцца своечасова без спазьненьня. 1-я лекцыя будзе па Сьветабудове. ЦС СВБ БССР

Сёньня, 19-га лістапада, у 7 г. у памяшканьні ДВБ Юндзетсэнтар і МенАПП склікаюць **сход аўтараў працуючых па дзіцячай і юнацкай літаратуры.** ПАРАДАК СХОДУ: 1. Арг. даклад Юндзетсэнтару. 2. Даклад аб стане дзіцячай літаратуры. 3. Арганізацыя секцыі дзіцячых пісьменьнікаў пры МенАППу. 4. Разгляд тэмплану Юндзетсэнтару на 1932 г. Просьба да ўсіх таварышоў зьявіцца.

ДОМ ПІСЬМЕНЬНІКА (Савецкая, 68) **„Літаратура на службу сацыялістычнаму будаўніцтву“ Выстаўка МенАПП-у** адчыненая штодзённа з 12 да 3 г. дня і з 6 да 9 г. вечара. Арганізаваныя экскурсіі пакінуць падаюць заяўкі на месцы на тэл. № 5-77 т. Крупскаму. Пры ўмове вялікай колькасьці наведвальнікаў МенАППам можна ў сустрэчы экскурсантаў з пісьменьнікамі. Уваход на выстаўку вольны.

Сваячасова подпісвайцеся на сьнежань і далейшыя месяцы на газэту „ЗЬВЯЗДА“ Орган ЦК К